КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 44 (220) ◂ 3 снежня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ПАСЛЯ КРЫЗІСУ**

Стар. 4

**НЕ ПАДДАВАЦЦА НА ПАДМАН**

Пра лідэраў і аўтсайдэраў выбарчай кампаніі разважае палітолаг Уладзімір Мацкевіч

Стар. 5

**БРЫТАГАЛОВЫЯ ПРАФСАЮЗЫ**

Пад уплывам сацыяльных пратэстаў супраць пенсійнай рэформы французскія ўльтраправыя вырашылі заняцца прафсаюзным будаўніцтвам

Стар. 11

**РЫГОРУ КОБЕЦУ — 110**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ВАЛЬТЭР КІТ — СЫН БАРЫСА КІТА**

Нарыс Андрэя Майсяёнка

▸ **ВЫБАРЫ**

# КАНДЫДАТЫ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

**Вольга ХВОІН**

**Выбарчая кампанія дала магчымасць патрапіць у дамы беларусаў людзям, якія звычайна знаходзяцца на ўзбочыне публічнага жыцця. Альтэрнатыўныя кандыдаты атрымалі магчымасць на дзяржаўным тэлеканале ў прамым эфіры без цэнзуры агучыць сваю пазіцыю, праграму, адносіны да цяперашняга кіраўніцтва Беларусі.**




Аляксандр Лукашэнка з усёй моцы імкнецца стварыць вобраз дэмакрата, які дае свабоду апанентам і магчымасць выбару грамадзянам Беларусі. Але канцэнтрацыя альтэрнатыўнага светабачання на першым тэлеканале, відаць, яго крыху занепакоіла, бо прэзідэнт не ўстрымаўся, каб не лінуць бруду ў бок сваіх канкурэнтаў. «Трэба вымалеваць, вобразна намаляваць партрэт альтэрнатыўных кандыдатаў. Людзям трэба растлумачыць, што ніякай розніцы ў іх няма. Усё, што яны гавораць, — гэта хлусня. Я ведаю ўсю іх паднаготную. Усе яны выраслі з аднаго кораня», — выказаўся наконт сваіх апанентаў у выбарчай кампаніі Аляксандр Лукашэнка.

Так, усе альтэрнатыўныя кандыдаты сёлетняй выбарчай кампаніі ў той ці іншай ступені аднаго поля ягады — выйшлі з апазіцыі, незадаволеныя дзейнай уладай, а частка нават мае з ёй уласныя рахункі. Яднае і абагульняе іх і крытыка рэжыму, персоны Лукашэнкі, які «скраў выбары». Але застаюцца адрозненні ў бачанні будучыні дзяржавы, яе знешняй палітыкі, і ўрэшце ў пазіцыянаванні сябе, манеры маналагічнага дыялогу з Аляксандрам Лукашэнкам.

Бадай што найбольш каларытнымі, запамінальнымі былі тэлевыступы Міколы Статкевіча, Рыгора Кастусёва, Уладзіміра Някляева. Цікава, што першапачаткова ролі лідэраў гонкі надаваліся кандыдатам Уладзіміру Някляеву і Андрэю Саннікаву. Але апошняга на рэйтынгавай лінейцы мае магчымасць пацясніць Статкевіч, бо ён адышоў ад зачытвання праграмных тэзаў у бок жорсткай канстатацыі праўды і недыпламатычных характарыстык дзяржаўнага ладу: карупцыя, хабар, пацёмкінскія вёскі, перанасычанасць турмаў, адрэтушаваная рэчаіснасць па тэлебачанню, якое засцiць праўду. «У нас імітацыя не толькі выбараў — імітацыя жыцця», — канстатаваў у сваім эмацыйным выступе Мікола Статкевіч. Фактычна ён пераняў ролю Аляксандра Казуліна — адчайнага кандыдата выбарчай кампаніі 2006 года, ролю чалавека, які можа ўзначаліць радыкальна настроеныя розумы. Хіба што Статкевічу, нягледзячы на навуковую ступень у галіне тэхнічных навук, бракуе вобразу інтэлігентнага чалавека.

Кандыдат Уладзімір Някляеў паказаў, якой маляўнічай можа быць палітычная барацьба — з вершамі, лірычнымі вобразамі «нахолившихся, как воробышки, чернобыльских инвалидиков», з самапрэзентацыяй сябе ў розных вобразах — ад чалавека жывога да фігуры з пластыку. Ці дастаткова гэтага, каб павесці за сабой тысячы, — будзе зразумела менш чым праз тры тыдні. Але палітычная тусоўка мусіць быць удзячная гэтаму чалавеку толькі за тое, што ён паказаў прыклад нетыповай для абшараў Беларусі кампаніі.

Кагорта кандыдатаў у прэзідэнты была б няпоўнай без Рыгора Кастусёва, які балатуецца ад партыі БНФ. Беларускі тыпаж, які не выклікае зайздрасці, непрыязі ці іншых негатыўных эмоцый. Невядома, ці «выстраліла» б фігура Кастусёва на сапраўдных выбарах, але дакладна ён зрабіў нямала, каб паказаць, у тым ліку і Лукашэнку, што «сябры БНФ — не ворагі, не адмарозкі ці ўласнікі якія-небудзь».

Доступ да дзяржаўнага тэлебачання, хоць і лімітаваны, кружыць галаву. Людзі пачынаюць верыць у шчырасць намераў правесці празрыстыя выбары, верыць ва ўласныя шанцы абысці Аляксандра Лукашэнку. З імпэтам агучваюцца праграмы, раздаюцца абяцанні. У гэтым ёсць сэнс, бо ўсё ж беларусам карысна ведаць, што не толькі ідэя стабільнай Беларусі мае права быць. Але забываецца старая ісціна: «Хто валодае інфармацыяй — той валодае светам».

Выбарчая кампанія скончыцца, рабіць добрую міну больш не будзе патрэбы, і ўсе вернуцца на свае месцы: адны — у кабінеты ўлады, іншыя — на палітычную ўзбочыну. Тым больш, інструменты для падтрымання працы наладжанага дзяржаўнага механізма працуюць. Так, у распараджэнне журналістаў інтэрнэт-рэсурсу «Белорусский партизан» трапіў ліст, які нібыта зыходзіў ад кіраўніка ідэалагічнай вертыкалі Гомельскай вобласці Анатоля Кацілы і быў адрасаваны рэдакцыям мясцовых дзяржаўных СМІ.

Наколькі тое адпавядае рэчаіснасці, найлепш ведаюць кіраўнікі дзяржаўнай прэсы. Але і нашым чытачам гэта карысна для азнаямлення. У лісце прадпісана бліжэйшым часам правесці апытанне сярод мясцовых жыхароў і апублікаваць яго вынікі. Да ліста прыкладаюцца не толькі пытанні, датычныя выступаў кандыдатаў, але і ўзоры адказаў на іх, усе — крытычныя, са старымі, як рэжым у Беларусі, тэзамі, што альтэрнатыўныя кандыдаты нічога новага не прапануюць і ўвогуле не ўражваюць.

Так што, спадары кандыдаты ў прэзідэнты, як ні круціцеся, але «грамадская думка» кажа, што вы на адзін твар, з нясвежымі ідэямі і неразуменнем працы дзяржаўнага кіравання. А дыпломы свае і веды... хіба што пакіньце да лепшых часоў. Ці насуперак прапагандзе, доказвайце адваротнае.

ВЫБАРЫ

# ПРАДЧУВАННЕ ФАЛЬСІФІКАЦЫЙ

Генадзь КЕСНЕР

**Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў не жадае рабіць прэзідэнцкія выбары празрыстымі і адпавядаючымі міжнародным стандартам. Пра гэта на прэс-канферэнцыі заявілі каардынатары кампаніі «За справядлівыя выбары» Сяргей Калякін і Віктар Карняенка.**




Сяргей Калякін падкрэсліў, што цяперашнія прэзідэнцкія выбары не могуць быць прызнаны адпаведнымі міжнародным стандартам свабодных, дэмакратычных і справядлівых выбараў.

«Змяніць нічога нельга, бо адсутнічаюць базавыя ўмовы ў палітычнай сістэме, як то свабода слова, асацыяцый, свабода мітынгаў і шэсцяў, свабода сходаў, свабода атрымання і распаўсюду інфармацыі, свабода СМІ і гэтак далей. З тым, што выбары не будуць прызнаныя, змірыліся ўсе, у тым ліку і ўлада. Але пытанне палягае ў тым, ці будуць нейкія прагрэс і сведчанні таго, што Беларусь рухаецца ў накірунку гэтых стандартаў», — адзначыў кіраўнік Беларускай партыі левых «Справядлівы свет».

Як распавёў каардынатар кампаніі «За справядлівыя выбары», ЦВК фактычна не пагадзіўся зрабіць самі выбары поўнасцю празрыстымі і адкрытымі. Цэнтрвыбаркам, напрыклад, не пагадзіўся, каб бюлетэні падпісвалі ўсе сябры ўчастковых камісій, а не толькі два асобна вызначаныя чалавекі. «У нас ёсць звесткі пра тое, што яны падпісваюць два камплекты бюлетэняў — адным галасуюць выбаршчыкі, а другі ляжыць гатовы з тымі вынікамі, якія патрэбныя ўладзе», — сказаў Калякін. ЦВК адхіліў прапанову пра кругласутачнае назіранне за скрынямі для датэрміновага галасавання.

«Я мушу заявіць, што дзяржаўныя СМІ, якія з'яўляюцца менавіта дзяржаўнымі, а не асабістымі сродкамі масавай інфармацыі Аляксандра Лукашэнкі, у парушэнне свайго статуса ўключыліся ў агітацыю за аднаго кандыдата ў прэзідэнты і ў паліванне брудам, якое даходзіць да прамых абразаў, у дачыненні да іншых прэтэндэнтаў на вышэйшую пасаду ў дзяржаве. На вялікі жаль, да гэтай кампаніі шальмавання з дапамогай дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі падключыліся і сябры Цэнтральнай камісіі, я маю на ўвазе Лідзію Ярмошыну і Мікалая Лазавіка. Дзяржаўныя СМІ са сродкаў масавай інфармацыі сёння ператварыліся ў сродкі масавай прапаганды, прычым прапаганды з выкарыстаннем недапушчальных метадаў у дачыненні да грамадзян», — лічыць Сяргей Калякін.

Такім чынам, каардынатары кампаніі «За справядлівыя выбары» канстатуюць, што «ўлада не жадае нічога прадпрымаць дзеля зніжэння ўзроўню магчымых фальсіфікацый, але наадварот, улады ствараюць усе ўмовы для таго, каб фальсіфікацыі былі магчымы. А гэта сведчыць пра тое, што дзеючы прэзідэнт не можа перамагчы на сумленных выбарах, і толькі з дапамогай фальсіфікацый можа быць забяспечана яго перамога ў першым туры».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЗВАРОТ

Аляксей ХАДЫКА

**Напрыканцы лістапада адбылося гадавое пасяджэнне Рады Таварыства беларускай мовы.**

Кола пытанняў, можна сказаць, было традыцыйным. Прысутныя праслухалі справаздачныя даклады пра дзейнасць за 2010 год Старшыні ТБМ Алега Трусава і яго намесніцы Алены Анісім. Але былі і пытанні, якія выклікалі жывыя спрэчкі. Прыкладам, пра Зварот Рады ТБМ да ўдзельнікаў IV Усебеларускага народнага сходу пра неабходнасць адраджэння роднай мовы. Было заўважана, што ўдзельнікі папярэдніх сходаў упарта пазбягалі ўжывання беларускага слова. Праўда, некаторыя ўдзельнікі пасяджэння Рады ТБМ выказалі меркаванне, што гэта робіцца адмыслова, проста каб не паганіць беларускую мову ў такім месцы. Была складзеная спецыяльная камісія для дапрацоўкі звароту (Генадзь Бураўкін, Уладзімір Колас, Алена Анісім), якія вырашылі ўсё ж такі зрабіць: хоць нейкі канал трансляцыі нармальных думак на народныя масы.

У выніку перавыбараў кіроўных органаў ТБМ адбыліся некаторыя нязначныя змены ў складзе Сакратарыята і рэдкалегіі газеты «Наша слова». У апошнюю дадалі прадстаўнікоў Віцебшчыны і Магілёўшчыны, каб палепшыць працу выдання і інфармацыйнае забеспячэнне.

Яшчэ адным цікавым момантам быў аповед Алены Анісім пра працу па праграме «Дыялог», падтрыманую ў 2010 годзе грантам Амбасады ЗША. У выніку ТБМ папоўніўся значнай колькасцю актыўных маладых людзей, якіх прыцягнулі арганізаваныя ў рамках «Дыялога» інтэлектуальныя дыскусіі. А вынікам зрабілася ідэя стварыць беларускамоўны аналаг «Што? Дзе? Калі?», пра выпуск якога ў эфір напрыканцы года ўжо дамоўлена з БТ.

З НАГОДЫ

# ФІНЛЯНДЫЯ, БЕЛАРУСЬ І ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ

Аляксандр СТУБ,
міністр замежных спраў Фінляндыі

**6 снежня Фінляндыя адзначае 93-я ўгодкі незалежнасці. Мы ганарымся сваёй паўночнай дзяржавай, якая ў 1917 годзе ў адгалоссі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі здабыла незалежнасць, змагалася за яе ў гады другой сусветнай вайны і развілася з беднай сельскагаспадарчай краіны ў адну з найбольш заможных краінаў свету. Сёння мы шануем памяць тых, хто загінуў у войнах, і выказваем падзяку тым ветэранам, якія яшчэ жывуць.**

Гісторыя Фінляндыі і Беларусі мае цікавыя паралелі. Нашы краіны ў мінулым уваходзілі ў склад магутных дзяржаваў: Беларусь — у склад Вялікага Княства Літоўскага, а Фінляндыя — у склад Швецыі на працягу амаль 700 гадоў. Па меры пасаблення гэтых заходніх дзяржаваў нашы краіны патрапілі пад уплыў магутнай дзяржавы, якая зараджалася на ўсходзе, г. зн. Расіі: у 1795 годзе — Беларусь, а ў 1809 годзе — Фінляндыя. Падчас рэвалюцыйных падзеяў у Расіі ў 1917–1918 гадах абедзве краіны дамагаліся незалежнасці. Фінляндыя дасягнула незалежнасці ў 1917 годзе і здолела яе захаваць. Лёс Беларусі складаўся па-іншаму, пакуль распад Савецкага Саюза ў 1991 годзе не змяніў сусветны парадак.

Беларусь — еўрапейская дзяржава, якая мае права на еўрапейскую будучыню. Беларусь — частка Еўропы, як дзякуючы свайму геаграфічнаму палажэнню, сваёй гісторыі і культуры, так і (што яшчэ больш важна) таксама дзякуючы сваёй асабістай волі. Спадзяемся, што Беларусь будзе эфектыўна праводзіць рэформы для забеспячэння больш шчыльнага супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам. Прыклад Фінляндыі мог бы служыць свайго кшталту арыенцірам, бо інтэграцыя Фінляндыі ў еўрапейскія структуры праходзіла паступова і стала часткай доўгатэрміновага працэсу.

Прамежак паміж удзелам Фінляндыі ў ГПТГ (Генеральнае пагадненне па тарыфах і гандлі — анг. GATT) і ўдзелам у Еўрапейскім Саюзе склаў 39 гадоў. У 1956 годзе Фінляндыя зрабілася сябрам ГПТГ, арганізацыі-папярэдніцы Сусветнай гандлёвай арганізацыі (анг. WTO). Інтэграцыя Фінляндыі ў Еўропу пачалася ў 1961 годзе, калі Фінляндыя зрабілася асацыяваным сябрам Еўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю (анг. EFTA). У 1972 годзе было падпісана пагадненне аб свабодным гандлі з Еўрапейскай эканамічнай супольнасцю (анг. EEC) і адначасова з ім пагадненне аб супрацоўніцтве з Саветам эканамічнай узаемадапамогі (анг. СМЕА). У 1986 годзе Фінляндыя зрабілася паўнавартасным сябрам Еўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю. У 1992 годзе Фінляндыя падала сваю заяву на сяброўства ў Еўрапейскім Саюзе, і ў 1995 годзе ўвайшла ў склад ЕС.

Інтэграцыйны шлях Фінляндыі быў доўгім і часам складаным у сувязі з тым, што яшчэ з часоў Савецкага Саюза стаўленне да вольнага гандлю ў межах ЕЭС было негатыўным. Фінляндыя здолела дзякуючы свабоднаму гандлю і інтэграцыі мадэрнізаваць сваю эканоміку і выйсці шырокім фронтам на еўрапейскія рынкі. З прычыны працяглага падрыхтоўчага перыяду сам працэс атрымання статусу сябра ў ЕС у 1990-я гады прайшоў хутка і адносна бязбольна. Тут можна адзначыць, што інтэграцыя Фінляндыі ў еўрапейскія структуры праходзіла з адначасовым захаваннем добрых стасун-



Аляксандр СТУБ

каў з Савецкім Саюзам, а потым — з Расіяй. Гандаль з усходнім суседам заўсёды быў надзвычай істотным для Фінляндыі. Расія і сёння з'яўляецца буйнейшым гандлёвым партнёрам Фінляндыі.

На падставе фінскага досведу магу з перакананасцю рэкамендаваць Беларусі сур'ёзна абмеркаваць прапановы Еўрапейскага Саюза, максімальна выкарыстоўваючы ўсе наяўныя магчымасці, здзяйсняючы рэформы хуткімі тэмпамі і выконваючы неабходныя патрабаванні. Гэта магло б шматкроць павялічыць аб'ёмы гандлю і інвестыцый паміж Беларуссю і краінамі ЕС.

Фінляндыя выступае прыхільніцай вольнага перамяшчэння грамадзян і спадзяецца, што Беларусь можа рухацца ў бок увядзення бязвізавага рэжыму. Вольнае перамяшчэнне людзей уваходзіць у лік базавых прынцыпаў Еўрапейскага Саюза.

У межах Еўрапейскага Саюза Фінляндыя актыўна падтрымлівае праграму Усходняга партнёрства. Мы жадаем зрабіць свой унёсак у працэс, які спрыяе збліжэнню Украіны, Малдовы і Беларусі, а таксама Арменіі, Азербайджана і Грузіі з Еўрапейскім Саюзам. Фінляндыя прытрымліваецца таго пункту гледжання, што Еўрапейскі Саюз мусіць надалей даваць больш адчувальную падтрымку рэформам краінаў-партнёрак. Рэформы адпавядаюць інтарэсам як вышэй азначаных краінаў, так і краінаў Еўрапейскага Саюза. Мы падтрымліваем бягучыя перамовы аб заключэнні пагадненняў аб асацыяцыі. Лічым, што бязвізавы рэжым з'яўляецца мэтай доўгатэрміновай перспектывы ў дачыненні кожнай з шасці краінпартнёрак.

На падставе сваёй уласнай гісторыі мы, фіны, непарушна верым у прынцыпы дэмакратыі, вяршэнства закону і грамадзянскай супольнасці. Мы высока ацэньваем грамадскую ролю няўрадавых арганізацый і СМІ. Мы спадзяемся, што няўрадавыя арганізацыі будуць шырока далучаныя да сферы дзейнасці «Усходняга партнёрства».

Гэтымі словамі я хацеў бы заахвоціць Беларусь да далейшых рэформаў. Беларусь мае ўсе падставы, каб ганарыцца сваімі дасягненнямі. Беларусы, якія прайшлі праз цяжкую гісторыю, зарабілі свае дасягненні, на фундаменце якіх краіна можа будаваць стабільную еўрапейскую будучыню. Мы, фіны, жадаем і надалей заставацца сябрамі Беларусі як у межах Еўрапейскага Саюза, так і праз нашы прамыя кантакты.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# У ВЫНІКУ НАПРУЖАНЫХ ПЕРАМОВАЎ…

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Здаецца, мы ўсё ж такі дагандляваліся са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Тое, пра што доўгі час, амаль паўгады, казаў амерыканскі ўрад беларускаму, усё ж адбудзецца. Беларусь заявіла пра намер ліквідаваць усе свае запасы высокаўзбагачанага ўрану да наступнага саміта па ядзернай бяспецы, які пройдзе ў 2012 годзе.**




У сумеснай заяве, прынятай па выніках сустрэчы дзяржсакратара ЗША Хілары Клінтан і міністра замежных спраў Сяргея Мартынава, што прайшла 1 снежня ў Астане падчас саміта АБСЕ, гаворыцца аб тым, што «прыняўшы гэтае рашэнне, Беларусь далучаецца да Злучаных Штатаў у міжнародных намаганнях па пераводзе ядзерных установак на выкарыстанне нізкаўзбагачанага ўранавага паліва, што ў XXI стагоддзі становіцца сусветным стандартам».

Са свайго боку, ЗША маюць намер аказаць тэхнічную і фінансавую дапамогу для найхутчэйшага ажыццяўлення гэтых мер.

Таксама ЗША падаравала Беларусі і пару «пернікаў». Як паведамляе знешнепалітычнае ведамства Беларусі, «абодва бакі абавязаліся працягнуць сумесную працу ў сферы забеспячэння ядзернай бяспекі, уключаючы павышэнне ўзроўню бяспекі ў Аб'яднаным інстытуце энергетычных і ядзерных даследаванняў у Беларусі». Мартынаў і Клінтан таксама абавязаліся ўмацоўваць глабальнае супрацоўніцтва ў сферы мірнага выкарыстання ядзернай энергіі ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і дадатковымі двухбаковымі дамоўленасцямі, якія могуць быць заключаны паміж Беларуссю і ЗША. Беларусь таксама аб'явіла пра намер дыверсіфікаваць энергетычнае забеспячэнне шляхам будаўніцтва сваёй першай АЭС грамадзянскага прызначэння. ЗША падтрымліваюць гэту дзейнасць, якая ўключае ў сябе спаборны працэс праектавання і будаўніцтва надзейнай і бяспечнай станцыі, што дзейнічае ў адпаведнасці з гарантыямі МАГАТЭ. ЗША таксама падтрымліваюць намаганні Беларусі па найхутчэйшай рэалізацыі гэтага камерцыйнага праекта», — гаворыцца ў паведамленні.

Амаль адначасова з «прызнаннем» будаўніцтва ў Беларусі атамнай станцыі, Міністэрства фінансаў ЗША 30 лістапада ў чарговы раз працягнула рашэнне пра змякчэнне санкцый у дачыненні да двух беларускіх прадпрыемстваў канцэрна «Белнафтахім» — ААТ «Лакафарба» і «Полацк-Шкловалакно».

Дзеянне санкцый прыпыненае да 31 мая 2011 года. У згаданы перыяд амерыканскім грамадзянам дазволена супрацоўніцтва з гэтымі беларускімі прадпрыемствамі, паведамляе афіцыйны сайт Мінфіна.

Разам з тым уласнасць ААТ «Лакафарба» і «Полацк-Шкловалакно» на тэрыторыі ЗША застаецца заблакіраванай у адпаведнасці з урадавым распараджэннем № 13405. Грамадзянам ЗША забаронена праз або пры пасрэдніцтве гэтых двух прадпрыемстваў купляць прадукцыю, паслугі і тэхналогіі ў іншых суб'ектаў гаспадарання, унесеных у спіс (маецца на ўвазе спіс прадпрыемстваў «Белнафтахіма», у адносінах да якіх санкцыі дзейнічаюць зараз).

Усе астатнія санкцыі ЗША, уведзеныя ў адносінах да канцэрна «Белнафтахім» і прадпрыемстваў, што ўваходзяць у яго, застаюцца ў сіле.

Нагадаем, у лістападзе 2007 года ЗША ўвялі эканамічныя санкцыі ў адносінах да канцэрна «Белнафтахім» у сувязі з парушэннем правоў чалавека ў Беларусі.

Між тым, што датычыцца правоў чалавека, то пазіцыя ЗША застаецца цвёрдай і нязменнай. ЗША «спадзяюцца ўбачыць істотны прагрэс» у сферы дэмакратыі і выканання правоў чалавека ў Беларусі. «Для паляпшэння двухбаковых адносінаў ЗША і Беларусі першачарговую важнасць па-ранейшаму мае праяўленне вялікай павагі да дэмакратыі і правоў чалавека, якое неабходна для прагрэсу краіны і яе грамадзян», — цытуе тэкст заявы прэс-служба МЗС Беларусі.

ЗША, у прыватнасці, спадзяюцца на адпаведнасць выбараў прэзідэнта Беларусі міжнародным стандартам. «У гэтых адносінах station ўчым крокам з'яўляецца рашэнне Беларусі накіраваць запрашэнне значнаму складу міжнародных назіральнікаў для ажыццяўлення назірання за правядзеннем выбараў», — зазначаецца ў заяве.

Так што гандаль будзе працягнуты — да варажэі не хадзі. Па якіх яшчэ параметрах — невядома, бо, здаецца, акрамя ўрану прапанаваць Беларусі Штатам няма чаго. Хіба што зноў палічыць колькасць палітзняволеных і пасадзіць за краты пару-тройку кандыдатаў у прэзідэнты. Усё роўна у нас іх зашмат.

На жаль, іншых прагрэсаў у нас пакуль не назіраецца. У распачынанні крымінальнай справы па факце смерці журналіста Алега Бябеніна будзе адмоўлена, паведаміла старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна Калініна.

Праверку акалічнасцяў смерці журналіста праводзіць пракуратура Мінскай вобласці. Тэрмін праверкі працягваўся двойчы, у чарговы раз ён заканчваецца 3 снежня.

Цела Алега Бябеніна, заснавальніка і кіраўніка папулярнага сайта www.charter97.org, было знойдзенае павешаным у пятлі 3 верасня ў яго загарадным доме ў вёсцы Пяхрува Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.

Да праверкі акалічнасцяў смерці журналіста прыцягваліся эксперты АБСЕ. У падрыхтаваным імі заключэнні сказана: вынікі ўскрыцця і рэчавыя доказы, сабраныя на месцы здарэння, «ясна сведчаць, што прычынай смерці стала самазабойства праз павешанне». «Ацэнка і аналіз экспертаў такія, каб на падставе доказаў і даступнай для іх інфармацыі яны прыйшлі да высновы, што няма прычын думаць, што Бябеніна павесілі пасля смерці», — гаворыцца ў паведамленні АБСЕ.

Многія калегі і сябры Бябеніна, у тым ліку кандыдат у прэзідэнты Беларусі, лідэр кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Андрэй Саннікаў, у чыю каманду ўваходзіў Бябенін, з версіяй самазабойства не згодныя.

Чакаць аб'ектыўнага расследавання гібелі журналіста Алега Бябеніна пры ўладзе Аляксандра Лукашэнкі бессэнсоўна, заявіў Саннікаў, каментуючы планы пракуратуры.

«Беларускія ўлады смерць Бябеніна пераварылі ў палітычную гульню з Еўропай. Экспертаў АБСЕ, якія прыязджалі для ацэнкі расследавання, яны папросту выкарысталі. І ні следства, ні эксперты АБСЕ не развеялі нашых сумненняў у тым, што Бябенін быў забіты, а не скончыў жыццё самагубствам. Наадварот, яны толькі ўзмацнілі нашы падазрэнні», — заявіў Саннікаў.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### СЯРГЕЙ БАЛЫКІН

Міліцыя шукае злачынцаў сярод эканамістаў, апазіцыянераў паводле іх «псіхалагічнага партрэту». Так, да Сяргея Балыкіна — старшыні праўлення Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва — міліцыянты прышлі ўначы зператрусам. У выніку забралі сродкі сувязі, наўтбук і флэшкі ад фотаапарата. Санкцыі пракурора не было.

Вобшук адбываўся ўначы з 26 на 27 лістапада, пастанова на яго правядзенне была падпісаная следчым «па неадкладнай неабходнасці». Прычыну начнога ўварвання ў кватэру патлумачылі тым, што быццам была аператыўная інфармацыя, што ў кватэры знаходзяцца выбуховыя рэчывы. Міліцыянты дадалі да гэтага і расследаванне выбуху самаробнай бомбы на святкаванні Дня незалежнасці ў 2008 годзе. Праўда, Балыкін у гэты час знаходзіўся па-за межамі Беларусі — прымаў удзел у працы Універсітэта дэмакратыі пры Савеце Еўропы. Пасля ператрусу Сяргея Балыкіна адвезлі ў РУУС Мінска і яшчэ чатыры гадзіны з ім размаўлялі на тэму паездак за мяжу, кантактаў, заданняў спецслужб. Працэсуальны статус Балыкіна невядомы.

Сяргей Балыкін па адукацыі юрыст і мае намер адстойваць свае правы, ён плануе звярнуцца ў пракуратуру са скаргай на дзеянні супрацоўнікаў міліцыі, якія праводзілі ў яго вобшук.

### МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ



Старшыня прэзідыўма Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч заявіў, што працы па стварэнні Цэнтра кіравання палётамі новага касмічнага апарата дыстанцыйнага зандавання Зямлі завершаныя. Беларускі спадарожнік будзе выведзены на арбіту разам з расійскім кластарным запускам у наступным годзе. Мясніковіч сказаў, што асаблівая ўвага будзе нададзеная падрыхтоўцы беларускіх прадпрыемстваў да выкарыстання касмічных дадзеных. Гаворка ідзе пра лясную гаспадарку, прагназаванне надзвычайных сітуацый, складанне прагнозу надвор'я і інш.

Новы касмічны апарат будзе больш лёгкі і манёўраны за папярэдні. Яго вага складзе каля 400 кілаграмаў. Нагадаем, што першы беларускі спадарожнік пад назвай БелКА пацярпеў крушэнне падчас запуску. «Спачатку размова ішла пра нейкі паўтор спадарожніка БелКА, але ў працэсе рэалізацыі праекту, сумесна з падрадчыкам мы выйшлі на прынцыпова новы апарат, — аптымістычна зазначыў старшыня прэзідыўма НАН Беларусі. — Цікавасць да яго ўжо досыць высокая ў свеце. Тут закладваюцца самыя сучасныя тэхналогіі, у гэтым апараце ўкаранёныя самыя перадавыя тэхналогіі ў свеце».

Міхаіл Мясніковіч расказаў, што ў працэсе рэалізацыі сумеснага беларуска-расійскага касмічнага праекту выявілася значная цікавасць да распрацовак з боку трэціх дзяржаў «на паслугі, на прыборы, якія робяць беларускія спецыялісты». «Ужо ёсць адпаведныя замовы, якія ацэньваюцца ў 43–44 мільёна долараў, а ў перспектыве аб'ем работ перавысіць 200 мільёнаў долараў», — заявіў старшыня прэзідыўма Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.



### АЛЕГ ТРУСАЎ

Кіраўнік Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Алег Трусаў праявіў дыпламатычныя здольнасці і гатовы іх рэалізоўваць на практыцы. Размова ідзе пра стварэнне Рэспубліканскай грамадскай рады па справах культуры і мастацтва пры Савеце міністраў Беларусі. Грамадская рада ствараецца «для забеспячэння больш шырокага ўдзелу творчай інтэлігенцыі ў ажыццяўленні дзяржаўнай культурнай палітыкі, аб'ектыўнай ацэнкі праблемных пытанняў і распрацоўкі пэўных мераў па іх вырашэнню ў дзейнасці калектываў мастацкай творчасці і арганізацый культуры». Старшынёй рады з 68 чалавек зацверджаны міністр культуры Павел Латушка, а яго намеснікам — старшыня грамадскай наглядальнай камісіі пры Мінкульце па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны Анатоль Бутэвіч.

Зыходзячы з досведу працы ў Грамадскай кансультатыўнай радзе пры Адміністрацыі прэзідэнта, сябра рады, старшыня Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Алег Трусаў у інтэрв'ю БелаПАН зазначыў, што новы грамадскі орган дасць магчымасць працягнуць дыялог паміж уладамі і грамадствам. Паводле яго слоў, лепш дрэнны дыялог, чым яго адсутнасць наогул.

Трусаў выказаў спадзеў, што на пасяджэннях рады ў прысутнасці журналістаў «будуць узднімацца праблемы, і некаторыя з іх будуць вырашацца». «З якой хуткасцю — гэта залежыць ад Сідорскага і яго міністраў, — сказаў старшыня ТБМ. — Я з задавальненнем буду ўдзельнічаць ва ўсіх пасяджэннях рады, тым больш што ў склад яе ўваходзяць людзі, якія хочуць змяніць сітуацыю да лепшага».

▸ АНАЛІЗ

# ПАСЛЯ КРЫЗІСУ

Сяргей КАРОЛЬ,
фінансавы дырэктар MetLife holdynh



**Два гады таму, у пятніцу пасля Дня Падзякі, мы з галоўным рэдактарам «НЧ» наведалі аддзяленне буйнога амерыканскага банка ў горадзе Хьюстан. Манітор у холе быў адладжаны на трансляцыю канала CNBC, па якім 24 гадзіны запар падаюцца фінансавыя навіны. Пакуль супрацоўнікі банка працавалі з маім рахункам, я сачыў за экранам. Тыя кадры засталіся ў маёй памяці як найбольш жудасныя хвіліны крызісу.**

Лістапад 2008 года не быў пачаткам абвалу. Ён распачаўся з банкруцтва банка «Леман Бразэрс» (Lehman Brothers) у верасні. Выкліканая крызісам хваля панікі імкліва ўзрастала. Ужо былі выдаткаваны мільярды долараў на выратаванне фінансавага холдынгу AIG. Ужо Кангрэс ЗША прыняў так званы TARP — 700-мільярдны пакет дзяржаўнага інвеставання капіталу ў буйныя банкі краіны. Але менавіта тады, у лістападзе, крызіс дасягнуў той стадыі, калі можна было ўявіць сабе ўвесь жах будучыні, што ўжо зусім рэальна паўставала перад сусветам.

## Апакаліпсіс учора

Навіной таго моманту быў «Сіцібанк» (карпарацыі Citigroup Inc.), ці не адзіны сапраўды сусветны банк, вядомы жыхарам кожнай краіны, і якому належаць лаўры аднаго з ініцыятараў крызісу ад самага пачатку. Жах сітуацыі з канца 2008 года быў у тым, што нават мільярдаў з праграмы TARP «Сіцібанку» не хапіла. Чарговы тыдзень прыносіў новыя праблемы, і кожная з іх, як па ланцугу, вяла да новых і новых выбухаў. І вось ланцуг падабраўся да ядзернага запасу.

Рабілася зразумела, што маштаб праблемаў «Сіцібанка» быў большым за «Леман Бразэрс» і нават AIG. У адрозненне ад апошніх, крызіс «Сіцібанка» пагражаў ужо стратай грошай не прафесійных фінансістаў, а мільёнаў звычайных людзей. Калі б усе яны кінуліся за сваімі грашыма — так званы «набег на банк» — крызіс, які мы ведалі яго на папярэдняй стадыі, падаўся б нам дзіцячай гульнёй. Сучасныя банкі зрэдку маюць свабоднымі больш за 10 працэнтаў ад дэпазітаў насельніцтва. І калі кліенты «Сіцібанка» забяруць са сваіх рахункаў нават 50 працэнтаў, а затым паніка перакінецца на іншыя буйныя банкі, то ніводзін урад свету, ніякага памеру TARP, не будуць мець рэсурсаў, каб спыніць лавіну.

Гэты сцэнар азначаў бы сапраўдны апакаліпсіс. Калі лопаецца адразу ўся фінансавая сістэма, адбываецца эканамічны варыянт ядзернай зімы. Прадпрыемствы не могуць фінансаваць нават штодзённыя разлікі, знікаюць усе вытокі капіталу, падае попыт, закрываюцца цэлыя індустрыі. І могуць прайсці гады, пакуль новы эканамічны клімат узнікне на месцы попелу. Менавіта гэты сцэнар адбыўся ў 1929 годзе, з яго беспрацоўем да 25 працэнтаў і скарачэннем эканомікі на 47 працэнтаў. Палітычныя наступствы Вялікай дэпрэсіі добра вядомы.

Гэтую небяспеку разумелі ва ўрадзе, і таму прынялі вельмі рашучыя меры. Банк Федэральнага рэзерву купіў тады ў «Сіцібанка» ўсе «таксічныя» актывы, застрахаваў ад страт іншыя і наўпрост інвеставаў у «Сіцібанк» столькі, што фактычна нацыяналізаваў яго. Іншыя праблемныя банкі былі амаль гвалтоўна прададзены мацнейшым канкурэнтам. Банк «ВаМу», штат Вашынгтон — Washington Mutual (WaMu) — апынуўся ў руках «Чэйз Банка» (The Chase Manhattan Bank N. A.), «Ваковія» (Wachovia Corp.) — у банка «Уэлс Фарга» (Wells Fargo & Co.) з Сан-Францыска.

Урэшце, Федэральны рэзерв пайшоў на зусім беспрэцэдэнтны крок і запампаваў у банкаўскую сістэму больш за трыльён долараў праз набыццё аблігацый урада ЗША на простым рынку, каб заахвоціць банкі выдаваць крэдыт і набываць больш рызыкоўныя паперы, і гэтым стымуляваць эканоміку. Міжбанкаўскі крэдыт таксама часова гарантаваўся Федэральным рэзервам. Урады Брытаніі і краін ЕС прынялі адпаведныя меры.

Фармаванню гэтай палітыкі спрыяў той факт, што старшыня Федэральнай сістэмы, прафесар эканомікі Бен Бернанке, сур'ёзна вывучаў Вялікую дэпрэсію, па тэме якой нават абараніў доктарскую дысертацыю. Яго тэзіс — дэпрэсія была вынікам памылак цэнтральных банкаў, якія знаходзіліся ў палоне ідэалогіі класічнага капіталізму, і таму не здолелі зразумець, што ў час банкаўскай панікі няма забароненых метадаў выратавання. Абавязак Цэнтральнага банка ў час крызісу, пісаў Бернанке, — прадухіліць фінансавы набег на банкі ўсімі сродкамі — нават калі «спатрэбіцца скідваць грошы з гелікоптэраў».

Хіба толькі гэтай мерай і не скарысталіся ўрады заходніх краін цягам шасці самых гарачых месяцаў крызісу. У выніку ім хапіла крэдыту даверу, і свет амаль у апошні момант пазбег катастрофы — новай Вялікай дэпрэсіі.

Вядома, быў пэўны эканамічны спад — каля 3 працэнтаў — у ЗША і Паўночнай Еўропе, больш — у краінах еўрапейскай перыферыі, асабліва тых, якія моцна залежалі ад знешняга крэдыту, як Венгрыя, Латвія, а таксама сярод тых, дзе значна патаннела нафта (у Расіі). Прыкметна ўзрасло беспрацоўе. Але сапраўднай катастрофы — якая, калі верыць БТ, нібыта ахінула ўвесь, акрамя Беларусі, свет — на самай справе не адбылося.

Больш таго, амаль нечакана сітуацыя стабілізавалася, і эканамічны рост, хаця і недастатковы для павялічэння працоўных месцаў, вярнуўся ў пазітыўную стадыю ў большасці краін. Зноў адкрыліся рынкі, і па шмат якіх паказальніках выйшлі амаль на дакрызісны ўзровень.

## Нудысты ў час адліву

Аднак той вельмі пазітыўны факт, што апакаліпсісу не адбылося, не азначае, што жыццё проста вярнулася ў перадкрызісны лад. Наадварот, 15 верасня, дзень банкруцтва банка «Леман Бразэрс», бачыцца адным з тых, якія падвялі выразную рысу пад канцом эпохі. У нашым выпадку — эпохі аптымізму, лібералізму і дэмакратычнага прагрэсу, якая пачалася амаль дваццаць гадоў таму — пасля завяршэння «халоднай вайны». Найбольш выразныя адметныя рысы новай эпохі ўжо праглядаюцца.

Знакаміты амерыканскі інвестар Уорэн Бафет — даўні крытык эканамічнага буму — калісьці сказаў, што «толькі падчас адліву становіцца бачна, хто плаваў голым». Больш за дзесяць гадоў прыліў таннага крэдыту і няспынна даражэючай нерухомасці хаваў той факт, што цэлыя плыні эканомікі ЗША і еўразоны, кожная паасобку, плавалі аголенымі.

У ЗША жыццё па-за бюджэтам сканцэнтравалася найперш у спажывецкім сектары. За трыццаць апошніх гадоў рэальны заробак сярэдняга амерыканца амаль не змяніўся, а шмат у каго — асабліва ў працоўных без універсітэцкай адукацыі — заўважна знізіўся. Мільёны амерыканцаў, што раней маглі добра зарабляць цяжкай, але адносна нескладанай працай на канвееры ці тэкстыльным камбінаце, воляй глабалізацыі і тэхналогій выпалі з сярэдняга ў ніжэйшы клас. Але, як сказаў амерыканскі комік: «Гэта Амерыка — тое, што спыняецца рост заробкаў, не азначае, што спыняецца жыццё».

Жыццё працягнулася ў крэдыт. Зараз на сярэднюю амерыканскую сям'ю прыходзіцца 18000 долараў крэдыту, амаль напалову больш, чым у 1998 годзе, і гэта без уліку пазыкі на нерухомасць. Дзяржава таксама запазычылася — на дзве вайны і на палітычна папулярныя зніжкі ставак падаткаў.

І вось — адліў. Структурныя праблемы, выкліканыя канцом індустрыяльнай эканомікі ЗША, стратай канкурэнтаздольнасці вытворчасці, адлівам працы за мяжу і кепскім станам адукацыі, былі ўпершыню зарэгістраваны яшчэ напрыканцы 1980-х, але шмат гадоў хаваліся за нечаканым бумам пасля «халоднай вайны». Зараз яны выйшлі на паверхню, і крызіс сярэдняга класу, няўпэўненасць перад глабалізацыяй і раздробленне грамадства на адукаваны і неадукаваны класы гучна ўварваліся ў палітычнае жыццё краіны на восеньскіх выбарах у Кангрэс.

Еўропа таксама атрымала свой адліў, хаця ён мае форму больш дзяржаўную, але сутнасць тая ж — больш за дзесяць гадоў праект Еўропы фінансаваўся прылівам крэдыту. У час адліву стала бачна, што цудоўнае аднаўленне Поўдня Еўропы (і Ірландыі на Поўначы) — візітоўка пераўтвараючай моцы ЕС — фінансавалася прыкладна тым жа чынам, што і амерыканская спажывецкая хваля. У Грэцыі і Партугаліі — наўпрост праз дзяржаўныя запазычанні, у Іспаніі і Ірландыі — праз прыватны крэдыт.

Амаль уся Еўропа, акрамя Германіі і былых сацыялістычных краін, таксама страціла канкурэнтаздольнасць, вымушаная ўтрымліваць высокабюджэтныя сацыяльныя сістэмы, пазбаўленая магчымасці дэвальвацыі еўра. І вось — у хвалях адліву амаль захлынуліся некалькі ўрадаў, уводзячы цяжкія скарачэнні бюджэтаў, на вуліцах хвалі пратэсту. Пытанне навісла нават над самім еўра — бо немцы (і нават славакі) не хочуць плаціць за грэкаў, а грэкі крыўдуюць на «нямецкую фінансавую акупацыю». У ЗША «палітыка крыўды» на глабалізацыю, якую заўважыў яшчэ напачатку 1990-х гадоў нямецкі даследчык Ханс Бетц, выйшла на паверхню і вынесла ва ўладу сур'ёзную колькасць скрайне правых палітыкаў.

## Новыя хлопцы раёна

Тушэнне крызіснага пажару абышлося дорага. Усе заходнія ўрады выйшлі з крызісу з бюджэтамі, падобнымі на тыя, што маюць рынкавыя краіны пасля вялікай вайны. Запазычанні больш за 80 працэнтаў ВУП і дэфіцыты бюджэту зрабіліся нормай. У Еўропе з імі спрабуюць змагацца праз скарачэнне заробкаў і колькасці бюджэтнікаў. У ЗША, дзе як зніжэнне выдаткаў, так і падвышэнне падаткаў застаюцца палітычным самагубствам, пануе клімат партыйнай вайны. Але ўсяму заходняму свету не пазбегнуць балючага выбару паміж унутранымі праграмамі, знешнепалітычнымі амбіцыямі і шляхам развіцця.

Між тым, толькі нядаўна так званыя «ўзнікаючыя» краіны за час крызісу «ўзніклі» з усёй відавочнасцю і сталі паўнавартаснымі сябрамі Вялікай дваццаткі. У Азіі крызіс быў бышцам незаўважаны. Краіны, што прайшлі праз эканамічнае пекла ў 1998 годзе, былі добра падрыхтаваныя праз дзесяць гадоў, між тым іх колішнія настаўнікі з Захаду не выканалі ніводнай са сваіх уласных рэкамендацый.

У хворых заходніх банкі ў 2008 годзе ўліліся мільярды з Сінгапура, Кітая, і Персідскага Залива. Азіяцкія гіганты, а з імі Бразілія, не страцілі амаль ні працэнта хуткаснага развіцця. Ужо не толькі простая вытворчасць, але і навукаёмістыя індустрыі і нават сэрвісы перацякаюць з Захаду ў Індыю і Кітай. З эканамічнай вагой узрастае і палітычная, і вось ужо на лекцыю з Вашынгтону пра неабходнасць дэвальваваць юаня Пекін адказвае — як роўны — лекцыяй пра штучнае друкаванне грошай Федэральным рэзервам.

## У Беларусі — наадварот

Як заўжды, у Беларусі — наадварот. Калі, здавалася, увесь свет рухаўся да дэмакратыі і рынку, з Беларусі ішлі супрацьлеглыя навіны. Зараз, калі Захад застаўся сам-насам з праблемамі пасля адліву, Беларусь раптам пацягнула ў заходнім напрамку, а найвялікшы аматар дзяржаўнай мадэлі сацыяльнага рынку ганарыцца месцам у чацвёрцы лібералізатараў эканомікі. І калі адзін з самых ліберальных урадаў — канадскі — забараніў прадаваць «Поташ Корп», буйнейшае калійнае прадпрыемства, прычым не каму-небудзь, а братэрскім англічанам, ахоўнікі стратэгічнага багацця Беларусі сур'ёзна загаварылі пра продаж «Беларуськалія».

Так атрымалася таму, што крызіс, які спачатку выклікаў меншы эканамічны спад, чым, напрыклад, у Латвіі, на самай справе карэнным чынам змяніў эканамічны фундамент беларускага палітычнага ладу.

Крызіс падштурхнуў Расію, якая сама апынулася ахвярай, перагледзець дывідэнд на 100 мільярдаў укладзеных у падмацаванне беларускага эканамічнага цуду. І калі не спыніць яго цалкам, то істотна ўрэзаць. Прыкладна тады ж скончыліся крэдыты з лонданскіх банкаў.

Наступствамі крызісу экспарт з Беларусі ў Расію абваліўся на 40 працэнтаў, а тое, што ВУП Беларусі не скараціўся настолькі ж, тлумачыцца выключна нечаканай дапамогай МВФ. І хаця дзякуючы гэтай дапамозе «Беларусь Інкарпарэйтэд» таксама ўратавалася ад катастрофы, «цуд» відавочна скончыўся, і цяпер усім стала зразумела, хто купаўся голым у Нарачы. Яны зараз чакаюць прыліву і плануюць часткова прадаваць і возера, і нетры, і фамільнае срэбра — хоць на Захад, хоць на Усход — хто больш заплаціць. Так, наступствамі крызісу, нават Сінявокая зрабілася звычайнай краінай і разам з усім светам уступае ў новую эру глабальнага развіцця.

ЭКСПЕРТЫЗА

# НЕ ПАДДАВАЦЦА НА ПАДМАН

**Кампанія па выбарах прэзідэнта Беларусі ўступіла ў найбольш актыўную фазу — перыяд агітацыі. Гэтыя выбары цікавыя і геапалітычнай расстаноўкай сілаў, і ўнутрыдзяржаўнымі працэсамі. Знешне выглядае на тое, што Беларусь на парозе пераменаў, а «дзесяць адважных» кандыдатаў, уключна з Аляксандрам Лукашэнкам, насамрэч змагаюцца за галасы электарату. Пра тое, што з гэтага праўда, а што мана, хто лідэр, а хто аўтсайдэр, журналістка «НЧ» Вольга Хвоін размаўляе з палітолагам Уладзімірам Мацкевічам.**



Уладзімір Мацкевіч

***— Паводле дадзеных сацыялагічнага маніторынгу, праведзенага 16–19 лістапада Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі, калі б выбары адбыліся заўтра, за кіраўніка дзяржавы гатовыя былі б прагаласаваць 71,3% беларусаў. Рэйтынгі альтэрнатыўных Лукашэнку кандыдатаў, па дадзеных ІАЦ, не перавышаюць 1%. Ці адлюстроўваюць гэтыя лічбы рэальны стан?***

— Трэба абмяркоўваць метадалогію апытанняў і дакладнасць выканання працэдуры. Што тычыцца гэтага сацыялагічнага цэнтру, то, як паказваюць іх папярэднія апытанні, яны не могуць карыстацца даверам, бо няма незалежнай праверкі, праз эмпірычны досвед дадзеныя таксама не пацвярджаюцца. Гэтыя лічбы адлюстроўваюць афіцыйны прагназ, задачу, якая мусіць рэалізавацца на выбарах. Што тычыцца 1 % рэйтынгу, то ён не можа лічыцца сапраўдным, бо знаходзіцца ў межах памылкі выбаркі і такіх рэйтынгаў папросту не бывае ў сацыялогіі.

Больш даверу ўсё ж выклікае апытанне НІСЭПД, паводле якога, па ходу падпісной кампаніі, калі не рабілася наўмысных перашкодаў, вядомасць апазіцыйных кандыдатаў значна павялічылася. Магу меркаваць па сустрэчах па-за межамі свайго непасрэднага атачэння, вядомасць палітыкаў вагаецца недзе паміж 10–20 %, то бок людзі больш-менш ведаюць хаця б іх прозвішчы. Але такая вядомасць не надае папулярнасці, бо ў цяперашніх умовах гэта немагчыма. Толькі працэсы сапраўднай лібералізацыі маглі б стварыць сітуацыю, каб палітыкі маглі ўплываць на папулярнасць, вядомасць. Зараз жа хоць на галаве могуць стаяць, хоць любыя абяцанні даваць, але выніку ад гэтага мала.

Калі мы паглядзім на стан грамадскай свядомасці, СМІ, то ніякіх рэцэптаў, універсальных крокаў немагчыма цяпер зрабіць, каб эфектыўна падвысіць рэйтынг. Я нават не стаў бы кагосьці з кандыдатаў вінаваціць у пройгрышы, бо яны элементарна не могуць уплываць на сітуацыю ў такіх умовах.

***— Да выбараў застаецца так мала часу, а апазіцыя не тое што не дамовілася пра адзінага кандыдата, адзіную стратэгію, але кандыдаты нават не каардынуюць свае дзеянні з калегамі па цэху. Гэта паказчык моцы персаналій ці слабасці апазіцыі?***

— Гэта сведчыць пра стан не столькі свядомасці, колькі пра дрэнную арганізаванасць у палітычных колах. Амаль усе апошнія гады дзеючая ўлада, яе ідэолагі рабілі ўсё, каб паспрыяць разладу, дэмаралізацыі ў апазіцыі. Нешта супрацьпаставіць гэтаму, змагацца супраць падобных правакацый апазіцыя не можа, лёгка вядзецца на ўсе пасткі. Сённяшні рэжым гуляецца з грамадскай думкай як хоча, маючы для гэтага ўсе неабходныя рычагі. Што найбольш непрыемна, апазіцыйныя лідэры нават не ўсведамляюць таго, наколькі яны ёсць марыянеткамі ў руках кіруючага рэжыму.

***— Вы маглі б скласці агульны партрэт альтэрнатыўных кандыдатаў? Лукашэнка сказаў, што паміж імі няма розніцы, вы згодныя?***

— Не хацелася б пагаджацца ў гэтым сэнсе з Лукашэнкам, бо я асабіста бачу многа адрозненняў, але ён мае рацыю. Гэту розніцу можа заўважыць толькі дасведчаны чалавек, той, хто сочыць за беларускай апазіцыйнай палітыкай, мае доступ да альтэрнатыўных крыніц інфармацыі. Я знаёмы з усімі альтэрнатыўнымі кандыдатамі, апроч Уса. Для тых, хто не ў тэме, заўважныя павярхоўныя, аднолькавыя знакі, напрыклад бел-чырвона-белыя сцягі. Уся апазіцыя асацыюецца з БНФ, хаця яна цяпер не ёсць наймацнейшай, найбольш уплывовай апазіцыйнай партыяй. Пераканаць у адваротным можна толькі праз шырокую інфармацыйную плынь, тады і абывацелі ўбачаць адрозненні.

На сённяшні дзень, калі афіцыйныя СМІ імкнуцца не называць прозвішчы альтэрнатыўных кандыдатаў, калі паказваюць нараду Лукашэнкі са сваёй ініцыятыўнай групай, паказваюць іх твары, як звычайны глядач можа даведацца пра адрозненні паміж кандыдатамі? Таму Лукашэнка выказвае праўдзівае меркаванне, але ж гэта праца зробленая рукамі прапагандыстаў. Думаю, што і сам Лукашэнка бачыць і разумее, у чым розніца паміж тым ці іншым кандыдатам. Увогуле, уся сістэма пабудаваная так, каб не даць увайсці ў публічную сферу іншым людзям.




***— Якая будучыня чакае кандыдатаў пасля выбараў, калі яны прайграюць і не займеюць падтрымкі на паслявыбарчы перыяд, калі не будзе такой чаканай «плошчы»?***

— Я не вельмі веру ў нейкую «плошчу». Гэтай ідэяй нават няпроста «зацяжарыць». Выбары прызначаныя на халодны, неспрыяльны час, пад святы — думаю, ніводны з кандыдатаў не набярэ столькі галасоў, каб прапанаваць пайсці за сабой. Калектыўны прызыў таксама малаверагодны, бо кандыдаты ўсё ж розныя. Лёс іх таксама будзе розны, бо яны змагаюцца не супраць Лукашэнкі, а за свае карпаратыўныя мэты.

Напрыклад, Раманчук атрымае магчымасці ўзначаліць каляАГПэшныя колы, стане галоўным лібералам. У Някляева іншая мэта — замяніць Мілінкевіча, стаць першым тварам апазіцыі, прымальным на Захадзе, у Маскве, каб Някляеў мог уплывова гаварыць ад імя апазіцыі на міжнароднай арэне. Міхалевіч паціху-патроху выходзіць на першыя ролі, каб змагацца за статуснасць. Кастусёў змагаецца за вяртанне БНФ ролі ў палітыцы, вяртанне да перадавых шэрагаў, яго мэта падаецца мне найбольш прываблівай. Што тычыцца Цярэшчанкі ці Уса, то заўсёды ёсць тыя, хто шмат пра сябе думае, не разбіраючыся ні ў палітыцы, ні ў грамадскіх справах, выходзіць у публічную сферу, каб пакрасавацца. Калісьці такой персонай быў Скрабец, цяпер гэтыя людзі займаюць такую пазіцыю. Зазначу, што ўсе гэтыя мэты нічога агульнага не маюць са скасаваннем рэжыму.

***— Ці магчымае вяртанне ў realpolitik лідэраў мінулай выбарчай кампаніі — Аляксандра Казуліна і Аляксандра Мілінкевіча?***

— Думаю, Казулін сам не ставіць мэтаў вярнуцца на пазіцыі 2005–2006 года. Што тычыцца Мілінкевіча, то захаванне яго ў якасці лідэра папросту неабходнае, і думаю, што яго адмова ад удзелу ў брыдкіх, агідных выбарах — крок на захаванне сябе як палітыка, праўда, цяпер патрэбныя і іншыя захады. Мілінкевіч застаецца найбольш рэалістычным палітыкам, які цвяроза глядзіць на падзеі, разумее пазіцыі нашых суседзяў, стан апазіцыі. Захаваць яго ў палітыцы — у агульнанацыянальных інтарэсах, гэтаму трэба спрыяць. Неразумныя, эгаістычныя палітыкі працавалі на тое, каб разам з рэжымам дыскрэдытаваць Мілінкевіча пасля 2006 года. У гэтым працэсе супольна ўдзельнічалі і рэжым, і некаторыя з апазіцыйных лідэраў. Пра гэта трэба гаварыць, каб людзі разумелі, як адбываецца выцісканне аднаго з найбольш уплывовых палітыкаў з палітычнай прасторы.

***— Лукашэнка паступова займае нішы, якія шмат гадоў былі замацаваныя за апазіцыяй, магчымы варыянт, што пасля чарговай «элегантнай» перамогі ён здабудзе прызнанасць нават у апазіцыйна настроеных беларусаў, будзе прызнаны Захадам, які яго столькі год ігнараваў-выхоўваў?***

— Да такіх магчымасцяў трэба ставіцца як да верагодных, але думаю, што іх імавернасць моцна перабольшваецца. Так, адносіны да Лукашэнкі ў дэмакратычных колах пераглядаюцца, бачна, што няма моцнай альтэрнатыўнай фігуры, каб яму супрацьпаставіць. Палітыкі зацікаўленыя сочаць за эвалюцыяй рэжыму ў больш нацыяналістычны бок. Гэтыя крэн сапраўды ёсць, і ён не можа быць не заўважаны, але ж гэта не можа надаць Лукашэнку папулярнасці, прыязнасці ў дэмакратаў. Ён па-ранейшаму застаецца дыктатарам, узурпатарам, чалавекам, які ўстанавіў дыктатуру, таму яго эвалюцыя, змена палітыкі выкліканая аб'ектыўнымі прычынамі, а не эвалюцыяй асобы. І гэта таксама ўсведамляецца палітыкамі.

***— Некаторыя эксперты выказваюць меркаванні, што цяпер удалы час для фармавання таго, як будзе весціся далейшы дыялог з Еўропай. Застануцца жэсты з дэманстрацыяй гатоўнасці да дэмакратычных пераменаў, але сутнасць рэжыму кардынальна не зменіцца. І гэта прыме міжнародная супольнасць. Варыянт «цывілізаванай» манархіі, якую прызнае Захад, магчымы?***

— Думаю, што гэта самае складанае з усіх зададзеных пытанняў. Сэнс вось у чым: прызнанне Лукашэнкі з боку Захаду мае цалкам прагматычныя, рэалістычныя прычыны, бо трэба лічыцца з тым, што ў Беларусі зараз — устойлівы, стабільны рэжым. А Беларусь немагчыма пакінуць па-за еўрапейскай палітыкай, і перамовы трэба весці з тым рэжымам, які ва ўладзе. Па-ранейшаму не прызнаюцца легітымнасць улады, парламенту. Хутка паўстане пытанне фарміравання Еўранесту — парламенцкага вымярэння "Усходняга партнёрства", якое заблакаванае, бо ў нас няма законна абранага парламенту. Гэта будзе стаяць востра, прынцыпова. Калі мы разглядаем палітыку Беларусі, то трэба разглядаць два падыходы: умоўны — то бок высоўванне пэўных патрабаванняў, пасля выканання якіх будуць нейкія прэферэнцыі.

Другі падыход — інструментальны, ці сацыялізацыя рэжыму. Гэта калі робяцца паслабленні, крокі Захаду на збліжэнне з Беларуссю, спрыянне дэмакратызацыі. Цяпер Захад трымаецца інструментальнага падыходу, каб дасягнуць аднойчы колькаснай мяжы, і можна было б праводзіць сапраўдныя выбары, эканамічныя, палітычныя рэформы. Рэжым гэта разумее і хоча паказваць дэмакратызацыю, а насамрэч кантраляваць усе дэмакратычныя працэдуры. Апошнія месяцы гэта было добра бачна з грамадзянскай супольнасцю. ЕС патрабаваў удзелу грамадзянскай супольнасці ў міждзяржаўным дыялогу, улады Беларусі кажуць, што згодныя і ствараюць свае імітацыйныя, дэкаратыўныя формы.

І тут многае залежыць ад таго, ці здольныя мы гэта ўбачыць, не паддавацца на такі падман, тлумачыць па абодва бакі мяжы Беларусі, што ёсць насамрэч. Я не ўпэўнены, што гэта будзе здольная рабіць палітычная апазіцыя, бо яна кіруецца спрошчанымі схемамі і не мае такога разумення, яе падманыць прасцей.

## КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ЧЫМ РАНЕЙ, ТЫМ ЛЕПЕЙ



**Палітыкі і эксперты робяць мноства каментараў адносна стану эканамічнай і палітычнай сістэмы беларускай дзяржавы. Афіцыйныя асобы і тыя, хто ім інтэлектуальна служыць, лічаць, што ўсё робіцца належным чынам у адпаведнасці з беларускімі рэаліямі.**

Калі Лукашэнка даводзіць тым жа немцам, што створаная ім палітычная сістэма яго цалкам задавальняе, яму няма ніякай неабходнасці тлумачыць чаму. Гэта бяда немцаў, якім можа не падабацца, што гэта сістэма дазваляе яму заставацца на вяршыні ўлады, колькі захоча. Увогуле, немцы самі вінаватыя. Калі б яны з такім імпэтам, як гэта робяць зараз, кідаліся пад колы цягніка, што некалі вёз бальшавікоў у Расію, сусветная гісторыя пайшла б у іншым накірунку. І зараз нямецкім журналістам даваў бы інтэрв'ю не Лукашэнка, а нейкі іншы чалавек.

Увогуле, чаго Лукашэнку баяцца? Дзейнічае ў межах, якія не дазваляюць арганізаваць супраць маленькай, але ганарлівай Беларусі сумесны еўрапейскі крыжовы паход. Відавочна ж, не змогуць еўрапейцы дамовіцца на гэты конт. І Расіі, калі тая нешта прыдумае, не дадуць.

І тое праўда, што Лукашэнка не чакае ні ад каго ўхвалы, а ўсіх сваіх перамог дабіваецца тактыкай дробнага фолу. Таму і прыгаварвае — узяўся гуляць, цярпі.

Але пытанні ёсць у нас, у тым выразна неакрэсленым колькасна і якасна натоўпе тубыльцаў, якія не вераць, што менавіта такая сістэма адпавядае нацыянальным інтарэсам Беларусі. Бо яны выконваюцца толькі тады і настолькі, калі і наколькі супадаюць з інтарэсамі асоб, што рабілі дзяржаву «пад сябе», пад свае патрэбы.

Калісьці Гегель таксама лічыў, што менавіта ў прускай дзяржаве знайшоў сваё поўнае ўвасабленне абсалютны дух. Вялікі немец вельмі памыляўся. Але хто забароніць рабіць такія памылкі Лукашэнку? Для яго філасофія таксама ж не чужая. Мае поўнае права. А немцы павінны быць удзячнымі, што гэту сістэму ён стварыў не для іх, а для свайго народа. Інакш давялося б бюргерам рабіць свае справы тымі спосабамі, якія адпавядаюць нашым, гэта значыць, беларускім умовам. І паслухмяна крочыць за Лукашэнкам на шляху развіцця да ўзроўню сярэднееўрапейскай краіны. Такі ён чалавек, што можа і прымусіць.

Зразумела, яны маўчаць, як і чальцы выбарчых камісій. Але хіба ёсць што больш красамоўнае, за гэта маўчанне?

Калісьці паэт усклікнуў: калі б камні маглі гаварыць! Шмат што магла б распавядаць і выбарчая скрыня з празрыстымі сценкамі. Але наўрад ці хто параўнаецца ў красамоўнасці са звычайнай непразрыстай скрыняй, у якую кідаюцца бюлетэні датэрміновага галасавання. Зразумела, яна маўчыць, як і чальцы выбарчых камісій. Але хіба ёсць што больш красамоўнае, за гэта маўчанне?

Яно мае нашмат больш сэнсу, чым, прыкладам, у публічна выказаным намеры змагацца з бюракратызмам з удзелам структур грамадзянскай супольнасці — грамадскіх аб'яднанняў. Створаных не з дапамогай нават, а самімі бюракратычнымі структурамі і ў поўнай адпаведнасці з планам стварыць дзяржаву «пад сябе». Такую, пры якой можна было б мець надзейную крыніцу даходаў да скону дзён. А магчыма, і болей, перадаючы пасаду ўлюбёным нашчадкам.

Пра эканамічную сістэму нельга выказаць нават малую частку кампліментаў, якія мы выказалі сістэме палітычнай. Невядома, як там што задумвалася, але атрымалася зусім не па-людску. Гэтая сістэма не тое, каб не ўлічвала нацыянальныя інтарэсы, яна ўвогуле не мае ні стымулаў, ні механізмаў для самаразвіцця. Магчыма, Гегель палічыў бы яе нават разумнай, як і ўсё існае. Хоць, здаецца, пра яе ёсць іншы афарызм — належыць гібелі ўсё, што існуе.

Чым раней гэта здарыцца, тым лепей. На карысць такой высновы можна знайсці шмат тэарэтычных і нават філасофскіх аргументаў. Але ў праве на існаванне гэтаму бастарду, народжанаму ад перверсіўнай сувязі былога Вялікага Дзяржплана і мясцовай вертыкалі, адмаўляе нават афіцыйная статыстыка. Маркуйце самі.

За 9 месяцаў мінулага года знешнегандлёвы тавараабарот Беларусі склаў 35 мільярдаў долараў. З нагоды крызісу экспарт скараціўся да 15, імпарт да 20, а памер адмоўнага сальда крыху перавысіў 5 мільярдаў долараў. Сёлета гандаль ажывіўся. За студзень-верасень тавараабарот падрос да 41 мільярда долараў, экспарт — да 17,5, імпарт — да 23,5, адмоўнае сальда знешняга гандлю — амаль да 6 мільярдаў долараў.

Такім чынам, калі ўсе хвараюць — нам таксама дрэнна, калі тыя папраўляюцца — нам становіцца яшчэ горай. А смяротна і хранічнага хворага або лечаць радыкальнымі сродкамі, або абвяшчаюць родным, што лятальны канец непазбежны.

Каб ратавацца, трэба ведаць. Бо калі «беларуская мадэль» урэшце лясне, як некалі савецкая, большасць згубіць і тую дробязь, што нажыла за 16 гадоў разам з Лукашэнкам.

З НАГОДЫ

# ПЕРАВАРОТ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Гадавіну рэферэндуму 1996 года адзначылі ў Беларусі мітынгам і несанкцыянаваным шэсцем. І прайшла яна пад знакам маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбараў. Нягледзячы на розныя нюансы, якія адбіваюцца на адзначэнні гэтай даты, у Беларусі штогод узгадваюць 24 лістапада. Бо апаненты ўлады лічаць, што раней ці пазней давядзецца вярнуцца назад на сыходную кропку. Каб працягнуць той шлях, які быў перарваны 14 гадоў таму.**



Міхаіл Пастухоў

Цяперашняя палітычная сітуацыя, як мяркуе былы суддзя Канстытуцыйнага суда Міхаіл Пастухоў, нагадвае позніою савецкую эпоху перыяду Брэжнева. «Ужо ўсім зразумела, што ў нас застой, прычым вельмі моцны застой, — сказаў ён. — Неабходны станоўчы імпульс для развіцця і дзяржавы, і грамадства. Інакш будзе поўны развал беларускай дзяржаўнасці і дэградацыя грамадства».

Дэмакратычныя заваёвы, як канстатуе экс-суддзя, пасля рэферэндуму аддадзены забыццю. Гэта датычыцца інстытута парламентарызму, незалежнасці судовай улады, правоў чалавека. «Асноўным суб'ектам правятворчасці стаў прэзідэнт, — зазначыў ён. — Замест прынцыпу вяршэнства закона стаў дзейнічаць прынцып вяршэнства актаў прэзідэнта. Замест падзелу ўладаў — адзіная прэзідэнцкая ўлада».

## Перакройванне

Нагадаем, што на рэферэндум 1996 года былі вынесены змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю 1994 года. Яны тычыліся пашырэння паўнамоцтваў прэзідэнта. «Мы, суддзі, разумелі, што размова ідзе аб устанаўленні прэзідэнцкага кантролю над усімі органамі ўлады. І гэта ішло ўразрэз з Канстытуцыяй, якая прадугледжвала дакладны падзел уладаў, сістэму стрыманняў і процівагаў. Фактычна пад выглядам унясення паправак у Канстытуцыю прапанавалася прыняць новую Канстытуцыю», — нагадаў Міхаіл Пастухоў.

Канстытуцыйны суд большасцю галасоў вынес заключэнне, што папраўкі ў Канстытуцыю не могуць выносіцца на абавязковы рэферэндум. І могуць мець толькі рэкамендацыйны характар. Аднак Аляксандр Лукашэнка праігнараваў гэта рашэнне і ўсё зрабіў з дакладнасцю наадварот. Рэферэндум 24 лістапада 1996 года сталі называць яшчэ і «антыканстытуцыйным пераваротам».

Акрамя таго, рэферэндум праходзіў са шматлікімі парушэннямі і фальсіфікацыямі. Упраўленне справамі прэзідэнта друкавала бюлетэні, і іх колькасць была невядомая. Выяўляліся факты падробкі подпісаў выбаршчыкаў і пашкоджання пломб на ўрнах. Грамадская кантрольная камісія па назіранні за рэферэндумам зафіксавала больш за тысячу парушэнняў.

«Зараз асноўная ўлада знаходзіцца ў руках прэзідэнта. Усе астатнія органы — пры ім», — кажа Міхаіл Пастухоў. Аляксандр Лукашэнка робіць прызначэнні ад суддзяў вышэйшых судоў, прэм'ер-міністра, генпракурора да старшыні і членаў праўлення Нацбанка. «Гэта дэкаратыўныя органы, яны не маюць моцы», — адзначыў экс-суддзя Канстытуцыйнага суда.

## Выбар

Рэферэндум 1996 года паставіў удзельнікаў падзей перад маральным выбарам. І кожны зрабіў свой выбар.

73 дэпутаты Вярхоўнага Савета 13-га склікання накіравалі зварот у Канстытуцыйны суд. І ініцыявалі адхіленне А. Лукашэнкі ад пасады ў сувязі з фактамі парушэння ім Канстытуцыі. Яшчэ да рэферэндуму Канстытуцыйны суд прызнаў неканстытуцыйнымі 16 указаў прэзідэнта. А 103 дэпутаты сабраліся і прынялі рашэнне аб самароспуску ВС. І атрымалі месцы ў трансфармаваным органе — Палаце прадстаўнікоў. «Аднак Вярхоўны Савет быў распушчаны незаконна. Трэба было не менш 2/3 галасоў. Патрэбнай колькасці галасоў не хапала для роспуску», — адзначыў Міхаіл Пастухоў.

Пасля «ламання» дэпутатаў, якія выступілі за імпічмент Лукашэнку, 12 з іх адмовіліся ад подпісаў. Першым «забраў» свой подпіс Мікалай Лазавік, цяперашні сакратар Цэнтрвыбаркама. Кандыдат Віктар Цярэшчанка, які зараз балатуецца ў прэзідэнты, спачатку паставіў подпіс, потым адмовіўся, потым зноў звярнуўся ў Канстытуцыйны суд, потым зноў «забраў». Кіраўніка Цэнтрвыбаркама Віктара Ганчара, які выбіраўся Вярхоўным Саветам, Лукашэнка адхіліў ад пасады. І прызначыў замест яго Лідзію Ярмошыну.

Пасля адмоваў дэпутатаў, большасць суддзяў прагаласавалі за спыненне справы аб імпічменце. Бо для яе разгляду павінна было быць не меней 70 подпісаў.

Міхаіл Пастухоў выказаўся супраць гэтага рашэння: «Я лічу, што мы павінны былі разглядзець гэту справу да канца. Адкліканне дэпутатамі сваіх подпісаў ужо пасля пачатку вытворчасці ў сілу вымушаных абставін нельга лічыць прычынай для спынення справы. Канстытуцыйны суд, на маю думку, не праявіў прынцыповасць і не быў паслядоўным у гэтай гістарычнай справе».

Суддзям Канстытуцыйнага суда, якія галасавалі «няправільна» наконт вызначэння рэферэндуму, пасля яго правядзення «ненавязліва» прапанавалі напісаць заявы аб адстаўцы на імя А. Лукашэнкі. Міхаіл Пастухоў адмовіўся пісаць такую заяву. Напрыканцы студзеня 1997 года Лукашэнка ўказам вызваліў яго ад пасады. Суддзя аспрэчыў звальненне ў Камітэце ААН па правах чалавека. Гэта было адно з першых рашэнняў Камітэта ААН па фактах парушэння правоў чалавека ў Беларусі. Але ўлады Беларусі не аднавілі яго ў правах. Да цяперашняга часу не выканана ніводнага з такіх рашэнняў.

## Новы адлік

«Я лічу, што рэферэндум 24 лістапада 1996 года стаў рубіконам у найноўшай гісторыі Беларусі, — адзначыў Міхаіл Пастухоў. — Мы перайшлі ад дэмакратыі да дыктатуры. Прэзідэнт атрымаў права выдаваць дэкрэты, якія маюць сілу закона. Яны не кантралююцца нікім. Канстытуцыйны суд, сфармаваны прэзідэнтам у студзені 1997 года, не разглядзеў на прадмет канстытуцыйнасці ніводнага ўказа і дэкрэта. Хаця многія з іх істотна абмяжоўваюць правы і свабоды грамадзян».

На думку Міхаіла Пастухова, не толькі рашэнні па рэферэндуме 1996 года, але і 1995-га (аб змене сімволікі і дзвюх мовах), і 2004-га (зняцце абмежавання тэрмінаў на займанне пасады прэзідэнта) павінны быць ануляваны. «Бо яны супярэчаць Канстытуцыі, каштоўнасцям беларускага народа і беларускай дзяржавы», — перакананы ён.

«Мы павінны пачаць адлік новай гісторыі Беларусі з Канстытуцыі 1994 года, — лічыць Міхаіл Пастухоў. — Менавіта дзень рэферэндуму стаў ноччу для беларускай гісторыі. І пахаваў дэмакратыю і законнасць».

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 6 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50** Зона Х.
**07.30, 08.25** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** «У цэнтры ўвагі».
**10.35** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**11.00** Чацвёрты Усебеларускі народны сход. Прамая трансляцыя.
**13.45** Відэафільм АТН.
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** «Млын моды».
**16.30** Nota Bene.
**17.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**21.00** Панарама.
**22.30** Канцэрт.
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здорава!».
**11.00** Чацвёрты Усебеларускі народны сход. Прамая трансляцыя.
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.50** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**22.00** Навіны спорту.
**22.05** «Галасы».
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** Прэм'ера. «Кацярына III». Фільм 1-ы.
**00.45** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** СТБ прадстаўляе: «Мінскі час». Відэафільм.
**11.00** IV Усебеларускі народны сход. Прамая трансляцыя.
**14.00** «Зорны рынг».
**15.10** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «У тэму». Актуальнае інтэрв'ю.
**20.30** Фільм «Хачу дзіця». Украіна, 2008 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Гісторыя пра Трыстана і Ізольду». Германія - ЗША - Вялікабрытанія - Чэхія, 2006 г.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.00** Прыгодніцкі баявік «Ніколі не кажы «ніколі» (Вялікабрытанія-ЗША).
**11.25** Дакументальны фільм (Францыя).
**12.25** Пра мастацтва.
**12.55** Школа рамонту.
**13.55** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.50** «Міхаіл Савіцкі. Сказаць без слоў». Дакументальны фільм.
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Тэлебарометр.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Меладраматычны серыял «Сямейны дом» (Расія). 1-я серыя.
**19.05** Хакей. КХЛ. Поўначсталь (Чарапавец) - Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.10** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.50** Авертайм.
**00.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**01.15** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Гарадок».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Пакой смеху».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Застылыя дэпешы».
**22.20** Тэлесерыял «Целаахоўнік».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.10** «Дзяжурны па краіне».

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.40** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.35** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**21.40** Прэм'ера. Баявік «Псеўданім «Албанец»-3».
**00.05** «Сумленны панядзелак».
**01.00** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Мужчыны. Германія - Нарвегія. Шамперы (Швейцарыя).
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер(Нарвегія).
**13.25** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**13.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка праследу. Остэрсунд (Швецыя).
**14.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка праследу. Остэрсунд (Швецыя).
**14.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Дзень 3.
**19.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Дзень 3.
**02.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Выбары-2010.
**07.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Род Гальшанскіх».
**07.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**08.10** ПраСвет.
**08.40** Эксперт.
**09.00** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.35** Басаног па свеце (спазнаваўчая праграма): «Экспедыцыя на Мадагаскар».
**10.05** Дакументальная гадзіна: «Усяго найлепшага!», дак. фільм, 2008 г., Венгрыя–Аўстрыя–Германія.
**11.25** «Час гонару», серыял: 6 серыя.
**12.10** Фільматэка майстроў: «Пасля канца свету», маст. фільм, 1998 г., Балгарыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Выбары-2010.
**17.20** «Мой родны горад», серыял.
**17.45** «Час гонару», серыял: 6 серыя.
**18.30** Госць «Белсату».
**18.50** Вагон.
**18.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.15** Калыханка для самых маленькіх.
**19.25** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**19.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзень «Ч». Версія», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Выбары-2010.
**21.40** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**22.00** Два на аднаго: Азбука маладых (публіцыстычная праграма).
**22.25** Фільматэка майстроў: «Пасля канца свету», маст. фільм, 1998 г., Балгарыя.
**00.15** Аб'ектыў.

## 7 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50** Зона Х.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.15** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.30** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**11.00** Чацвёрты Усебеларускі народны сход. Прамая трансляцыя.
**13.15** Відэафільм АТН.
**13.30** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**14.00** Чацвёрты Усебеларускі народны сход. Прамая трансляцыя.
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.15** Навіны рэгіёна.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтарэсаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.55** Мастацкі фільм.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**01.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Бенфіка»-»Шальке».

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Выклік». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**22.00** Навіны спорту.
**22.05** «Уцёкі».
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** Прэм'ера. «Кацярына III». Фільм 2-і.
**00.45** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Хачу дзіця». Украіна, 2008 г.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Меч». Серыял.
**21.25** «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.55** «Спецкар аддзела расследаванняў». Серыял.
**00.45** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.30** Меладраматычны серыял «Сямейны дом» (Расія). 1-я серыя.
**10.40** Прыгодніцкая кінааповесць «Нязнайка з нашага двара» (СССР). 1-я серыя.
**11.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**12.45** Авертайм.
**13.15** «Запал па культуры».
**13.55** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.50** Дак. фільм «Дакрананне».
**15.20** Мультсерыял «Драконччык і яго сябры» (Канада).
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Меладраматычны серыял «Сямейны дом» (Расія). 2-я серыя.
**19.05** «Еўрапейскі канцэрт».
**19.55** «Калыханка».
**20.15** Тэлебарометр.
**20.20** «Актуальнае інтэрв'ю».
**20.30** Беларуская часіна.
**21.35** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. Манчэстэр Юнайтэд - Валенсія. Прамая трансляцыя.
**23.40** «Спорт-кадр».
**00.10** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Кацярына Фурцава. Жаночая доля». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «Застылыя дэпешы».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Застылыя дэпешы».
**22.20** Тэлесерыял «Целаахоўнік».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Першыя на Марсе. Няспетая песня Сяргея Каралёва». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Апошнія слова». Ток-шоў.
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.35** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**21.40** Баявік «Псеўданім «Албанец»-3».
**22.40** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. «Барселона» (Іспанія) - «Рубін» (Расія).
**00.40** «Вочная стаўка».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**11.15** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Мужчыны. Францыя - Германія. Шамперы (Швейцарыя).
**14.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Дзень 3.
**14.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Дзень 4.
**18.30** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Жанчыны. Швейцарыя - Германія. Шамперы (Швейцарыя).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** «Алімпійскі гульні. Лондан». Часопіс.
**20.15** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Дзень 4.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Дзень 4.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**00.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Агляд сезону.
**01.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Выбары-2010.
**07.40** Еўропа сёння.
**08.05** Госць «Белсату».
**08.25** Прыватная калекцыя.
**08.45** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: « Дзень «Ч». Версія», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**09.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**10.05** «Мой родны горад», серыял.
**10.30** «Час гонару», серыял: 6 серыя.
**11.15** Два на аднаго: Азбука маладых (публіцыстычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Выбары-2010.
**17.20** «Мой родны горад», серыял.
**17.45** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 14 серыя.
**18.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.55** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Род Гальшанскіх».
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Праект «Будучыня».
**20.10** Два на аднаго: Азбука маладых (публіцыстычная праграма).
**20.30** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Выбары-2010.
**21.40** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**21.55** Перад выбарам (аналітычная праграма).
**22.45** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма) .
**23.10** «Доктар Марцін», серыял: 14 серыя.
**23.55** Аб'ектыў.

## 12 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.55** Дзень спорту.
**08.05** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Альманах вандраванняў».
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** Культурныя людзі.
**11.20** «Школа доктара Камароўскага» (Украіна).
**12.15** «Еўрабачанне-2010». Міжнародны дзіцячы конкурс песні. Поўная версія.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.45** Меладрама «Вы не пакінеце мяне» (Расія).
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.05** Прэм'ера. Меладрама «Я так даўно цябе кахаю» (Германія-Францыя).
**01.05** «Sfilata». Дакументальны фільм.

---

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**10.00** «Шалапутныя нататкі».
**10.20** Пакуль усе дома.
**11.20** «Фазэнда».
**11.55** «Ранішняя пошта».
**12.30** Прэм'ера. «Уладар пластылінавых крумкачоў Аляксандр Татарскі».
**13.30** Тэлечасопіс «Звяз».
**14.00** «Галоўнае, каб гарнітурчык сядзеў».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай пажэнімся!».
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.45** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: ток-шоў «Кухня».
**21.40** «Лёд і полымя». Працяг.
**23.35** «Yesterday live».
**00.25** Камедыя «Дзе знаходзіцца нофелет?».

---

**05.20** Фільм «Вясёлае чараўніцтва». СССР.
**06.25** Фільм «Гнеў». ЗША - Вялікабрытанія, 2004 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «З каханымі не раставайцеся». СССР, 1979 г.
**15.30** «Дарагая перадача».
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Паварот». ЗША - Францыя, 1997 г.
**23.05** Фільм «Парыжская гісторыя». Францыя - Партугалія, 2006 г.
**00.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.10** Дабравест.
**07.35** Мір вашай хаце.
**07.50** Шпіёнская камедыя «Агент 117. Місія ў Рыо» (Францыя).
**09.40** Медычныя таямніцы.
**10.20** Школа рамонту.
**11.30** Тэлебарометр.
**11.35** Кінаспробы.
**11.55** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.35** Бухта капітанаў.
**14.15** «Правы чалавека».
**14.30** Гаспадар.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**15.55** Хакей. КХЛ. Нафтахімік (Ніжнекамск) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**18.15** Смешная часіна.
**18.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Тотэнхем - Чэлсі.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.15** Камедыйная меладрама «Разумнікі» (ЗША).
**23.10** Культасвет.
**23.40** Ricky Martin. «Black and White. Live». Канцэрт ( ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.30** Тэлесерыял «Сваты-3».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Саната над возерам».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.45** «Рамантыка раманса».
**16.35** Фільм «Пачатак».
**18.20** Прэм'ера. «Смяюцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера-2010. «Стылягі-шоў».
**23.00** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.10** Фільм «Уварванне».

### НТВ

**07.30** Мультфільм.
**08.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Справа цёмная».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.20** «Праслявана ў СССР» .
**14.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм'ера. Фільм «Штукар-2».
**00.05** «Асабліва небяспечны!».
**00.40** «Нерэальная палітыка».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**10.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Спроба 1.
**11.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 1.
**12.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Спроба 2.
**14.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 2.
**15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**16.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Спрынт вольным стылем. Мужчыны/жанчыны. Давос (Швейцарыя).
**17.25** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**17.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**19.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**19.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**20.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**21.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**00.30** Аўтаспорт. Цырымонія ўзнагароджання FIA па выніках года. Манака.
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.10** Калыханка для самых маленькіх.
**08.40** Навігатар.
**09.00** Макрафон: канцэрт «Ix N.R.M – ix Мроя», ч. 3.
**09.35** Вагон.
**09.40** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Ваўчыная маці», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**10.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.25** Два на аднаго: Азбука маладых (публіцыстычная праграма).
**10.45** Басанож па свеце: «Ежа з джунляў».
**11.10** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**12.10** «Вясёлых Калядаў, спадар Лорэнс!», маст. фільм, 1983 г., Вялікабрытанія–Японія.
**14.20** «Чароўнае дрэва», серыял.
**14.45** Два на аднаго: Азбука маладых (публіцыстычная праграма).
**15.15** Перад выбарам.
**16.00** «Бульбаны», мультсерыял.
**16.10** «Ранча», серыял: 12 серыя.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Час гонару», серыял: 7 серыя.
**18.05** Прыватная калекцыя.
**18.40** Дакументальная гадзіна: «Камунізм гісторыя адной ілюзіі», дак. фільм, 2005 г., Германія: 1 серыя, «Ленінская рэвалюцыя».
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Род Астрожскіх».
**19.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце: «Касміты».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.35** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Ангельскі тракт», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Іспанія–ЗША.
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Гісторыя зачараванага інструмента».
**00.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».

---

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: 8029 6043457, Юрый

Віцебск: 8029 3084978, Юрый

Масты : 8029 1387994, Дзмітрый

Мінск: 8029 9687973, Аляксей, 8 029 1783168, Вольга, 8029 6255751, Аксана

**Шаноўныя чытачы!**

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

Але для тых, хто падпішацца на «Новы час» да 1 студзеня, кошт застанецца ранейшы (500 руб нумар, 2000 — месяц).

**«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.**

**Даведка па тэл: 8029 6255751**

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11

почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ

почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

Для тых, хто прымае рашэнні!
Новы час
www.novychas.org

РЭФОРМЫ

# БРЫТАГАЛОВЫЯ ПРАФСАЮЗЫ

Алег НОВІКАЎ

**Пад уплывам сацыяльных пратэстаў супраць пенсійнай рэформы французскія ўльтраправыя вырашылі заняцца прафсаюзным будаўніцтвам.**



Аўтарам ідэі «інвеставаць наяўныя сілы ў лагер прафсаюзаў» выступіў лідэр парыжскіх правых радыкалаў Серж Айуб (Serge Ayoub). Па яго словах, прыйшоў час «перацягнуць на свой бок працоўных».

Серж Айуб — культавая постаць у праварадыкальным асяроддзі. У 1980-я гады ён быў галоўным сталічным скінхедам, лідэрам групоўкі Нацыянал-рэвалюцыйная моладзь. З часам былы брытагаловы пачаў больш цікавіцца не высвятленнем адносінаў з дзецьмі эмігрантаў, а прафсаюзнай дзейнасцю.

Па словах Айуба, прафсаюзы могуць стаць «альтэрнатывай як цынічнаму капіталізму, так і прадажным левым». Яны здольныя прапанаваць формулу рашэння грамадскіх праблем «не звяртаючыся да інструментарыя правых і ліберальных палітыкаў, адначасова адстойваючы сацыяльную справядлівасць і годнасць нацыі».

Серж будуе напалеонаўскія планы: «Калі мы ўвойдзем у прафсаюзы, мы зможам падарваць сістэму. Прафсаюзнае кіраўніцтва не мае нічога агульнага з базай нізавых актывістаў. Гэта папросту калабаранты. Для таго, каб радыкальна змяніць сітуацыю, трэба браць у рукі ўладу ў прафсаюзах і радыкалізаваць іх. Выкарыстанне сілы стымулюе інстытуты прамой дэмакратыі».

Цікава, што расавая тэматыка мала цікавіць аўтара канцэпцыі. «Пры гэтым тэма расы не адыгрывае ключавой ролі. Мы супраць этнічнай або расавай базы. Раса не з'яўляецца галоўнай праблемай у Еўропе і ў свеце. Галоўная праблема — гэта суадносіны сіл».

Тое, што ўльтраправыя зацікавіліся сацыяльнай тэматыкай, тым больш сёння, цалкам лагічна. Па-першае, у Францыі даўно ставіліся падобныя эксперыменты. Дастаткова згадаць Французскую народную партыю (PPF), якую ў 1930-я гады заснавала група былых камуністаў. У 1940-м PPF падтрымала гітлераўскую акупацыю, і нейкі час гітлераўская адміністрацыя актыўна дапамагала праекту. У 1920–30-я гады сябры манархісцкага руху «Французскае дзеянне» марылі пра сацыялізм як сродак нацыянальнай салідарнасці. Нарэшце, у 1980-я гады нават існаваў блізкі да партыі Нацыянальны Фронт (FN) гэтак званы Прафсаюзны нацыянальны калектыў, які ўмудрыўся знайсці сталую падтрымку сярод некаторых чыгуначнікаў, якія ўваходзілі ў прафсаюз «Працоўная сіла» (FO).



Па-другое, стваральнікі новага прафсаюзу выбралі правільны час. Звычайна французскія прафсаюзы — гэта арганізацыі з добрымі структурамі, сваёй прафсаюзнай мафіяй, унутранымі правіламі гульні. Калі пачынаюцца масавыя пратэсты, актыўныя пралетарыі, асабліва моладзь, часта не знаходзяць сябе ў падобных схемах, шукаюць нешта новае. Так, на хвалі забастоўкі 1995 года быў створаны абсалютна новы прафсаюзны цэнтр SUD.

Аднак галоўная аўдыторыя Айуба — не актыў, а працоўныя, якія падтрымліваюць вядучую правую партыю Нацыянальны Фронт. На пачатку 1990-х гадоў, калі адышоў у лепшы свет СССР, адбылася дэфрагментацыя электарату кампартыі. Шмат хто з рабочых пачаў цікавіцца тэзісам пра тое, што за ўсе сацыяльныя праблемы нясуць адказнасць эмігранты і, адпаведна, галасаваць за Нацыянальны Фронт. Тое, як паводзіў сябе FN у часы нядаўніх пратэстаў супраць рэформы пенсійнай сістэмы, выклікала сярод такіх людзей вялікую фрустрацыю.

Пачаць трэба з таго, што ў партыйнай праграме FN чорным па белым запісана, што французы павінны выходзіць на пенсію ў 65 гадоў. Жан-Мары Ле Пэн — лідэр FN — увогуле заклікаў да таго, каб пенсіянерамі ў Францыі станавіліся ў 80 гадоў. Таму, калі пачаліся пратэсты супраць прапановы ўраду пра выхад на пенсію ў 62 гады, правыя аказаліся ў даволі камічнай сітуацыі. 26 верасня яны правялі спецыяльную нараду па рэформе і прыдумалі наступнае: трэба, каб на пенсію выходзілі па свайму жаданню з умовай наяўнасці 40-гадовага працоўнага стажу. Пратэсты прафсаюзаў Ле Пэн назваў «сацыяльнай дэмагогіяй».

Між тым, стачкі і маніфестацыі пачалі набываць масавы характар, які нельга было ігнараваць. Па апытаннях, каля 68 працэнтаў насельніцтва былі супраць рэформы. Тады «франтавікі» хуценька сталі на бок дэманстрантаў. Адзін з кіраўнікоў фронту Марына Ле Пэн (дачка Жан-Мары) публічна заявіла, што «жадае выбуху сістэмы». Праўда, пры гэтым яна падкрэсліла, што ні ўрад, ні левая апазіцыя, у адрозненні ад Нацыянальнага Фронту, «не з'яўляюцца партыямі змен і надзеі».

22 кастрычніка пачалі прыходзіць навіны пра сутычкі студэнтаў і працоўных з паліцыяй падчас спроб заблакаваць склады з бензінам. Фронт адразу зрабіў разварот на 180 градусаў, патрабуючы ад Сарказі не праяўляць «ніякай талерантнасці да ўдзельнікаў пратэстаў». Блізкая да партыі Ле Пэна прэса падавала на сваіх старонках страйк як змову гультаёў і мусульман, якія абвясцілі забастоўку, каб як людзі адсвяткаваць Рамадан. Пісалі, што за бойкі з паліцыяй адказныя не французы, а люмпены з эміграцкіх кварталаў.

Такая непаслядоўная палітыка выклікала ступар у частцы франтаўскага электарату, які таксама стаў ахвярай пенсійнай рэформы. Меў месца цікавы выпадак: адно выданне некарэктна перадало словы Марыны Ле Пэн. У выніку атрымалася фраза пра тое, што яна быццам гатова «далучыцца да левых радыкалаў» у барацьбе з рэформай. Некаторыя правыя блогеры на месцах адразу перадрукавалі сенсацыйную навіну, адначасова заклікаўшы ўсіх сяброў Нацыянальнага Фронту ісці на вуліцу.

Можна зрабіць заключэнне, што Нацыянальны Фронт не здолеў выйсці за рамкі партыі кансерватыўнага рэакцыйнага характару. Гэтым спрабуе скарыстацца невялікая група правых, якія падтрымалі нядаўнія забастоўкі, разглядаючы іх як пратэст супраць глабальнай капіталістычнай эліты.

Пакуль, аднак, іх поспехі сярод рабочых вельмі сціплыя — толькі невялікая група актывістаў, сябры прафсаюзу Федэрацыя кандуктараў, перайшла на іх бок. Больш-менш дакладна меркаваць пра перспектывы новага прафсаюзу (дарэчы, яго назва — «Роўнасць і гонар») можна будзе ў сакавіку наступнага года, калі яго актыў правядзе ў Парыжы маніфестацыю памяці Парыжскай камуны.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Канфлікт з Расіяй згуляў на руку прэзідэнту Лукашэнку, за якім у насельніцтва ўмацаваўся імідж абаронцы суверэнітэту Беларусі. Аднак як доўга дзяржаве ўдасца заставацца незалежнай? Ці зможа Мінск эканамічна вытрымаць, калі з 2011 года кошты на энерганосьбіты з Расіі стануць рынкавымі? Запазычанасць Беларусі ўжо цяпер складае 30 працэнтаў ад ВУП. На новыя крэдыты ад МВФ з-за адсутнасці прагрэсу ў лібералізацыі разлічваць не даводзіцца. ЕС абяцае падтрымку толькі ў тым выпадку, калі выбары ў снежні будуць свабоднымі і дэмакратычнымі.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Аляксандр Лукашэнка стаў лідэрам «новай» Беларусі, якая, разам з Грузіяй, паступова ператвараецца ў варожую Расіі дзяржаву, што ўсё больш абсарбуецца Заходняй супольнасцю. Разведвальныя службы заходніх краін, у каардынацыйным рэжыме, спрабуюць уключыць Беларусь у антырасійскі пакт дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, што ўжо не хаваецца ў рэспектабельнай прэсе Еўропы і ЗША. (...) Цяпер стала відавочным, што Масква даўно праводзіла падрыхтоўку як альтэрнатыўнага прэтэндэнта на пасаду беларускага прэзідэнта, так і магчымай новай каманды для Мінску. Цалкам верагодна, што менавіта гэта акалічнасць і стала галоўным чыннікам бунтарства А. Лукашэнкі, які не мог не разумець, што «новая палітыка» Расіі, якая прадугледжвае ўрэгуляванне адносін з ЗША і стварэнне палітычнага альянсу з вядучымі еўрапейскімі дзяржавамі, утрымлівае, як абавязковы пункт, змену кіраўніка Беларусі.

**«Иратес de facto» (Арменія)**

Аналізуючы тое, што адбываецца, мясцовыя назіральнікі пачынаюць захапляцца прэзідэнтам Лукашэнкам як дальнабачным палітыкам. Забеспячэнне ўладай адсутнасці бар'ераў на шляху да рэгістрацыі ў кандыдаты прывяло да таго, што запаветны статут атрымалі малавядомыя людзі, якія не маюць ніякага досведу палітычнай дзейнасці. Упершыню ў жыцці апынуўшыся перад камерай, яны запінаюцца і не маглі адарваць погляд ад выратавальнай шпаргалкі. У некаторых экспертаў узнікае заканамерная думка: а ці не сама ўлада замовіла гэтых нікому не вядомых спадароў арганізаваць патрэбны фон? Часта слаба выглядаюць і рэальныя прадстаўнікі апазіцыі. У прыватнасці зрабіў справаздачу пра адсутнасць прыбыткаў экс-намеснік міністра замежных спраў Андрэй Саннікаў.

**«Независимая газета» (Расія)**

Пазіцыя Еўрасаюза ў адносінах да рэжыму Аляксандра Лукашэнкі і хуткіх прэзідэнцкіх выбараў адназначная: неабходна, каб у суседняй з ЕС краіне мелі месца дэмакратычныя працэсы. Пры гэтым суседняя Літва праводзіць вельмі спецыфічную палітыку. І прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ, і ўрад гэтай краіны занадта моцна залучыліся ў дыялог з Мінскам. Тым самым Вільнюс рызыкуе сваёй надзейнасцю. Сітуацыя дайшла да таго, што палітыка Літвы стала ў нейкай ступені заканадаўчым таго, што адбудзецца ў Беларусі. З іншага боку, сёння Аляксандр Лукашэнка слабы як ніколі, а значыць, гатовы пайсці на пэўныя саступкі. Гэта дае падставы меркаваць, што Лукашэнка пойдзе на саступкі, але няма падстаў думаць, што ён дэмакратызуе сістэму ў краіне, бо гэта супярэчыць яго жаданню захаваць уладу.

**«Regnum» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ТАДЖЫКІСТАН. САМЫ ВЫСОКІ ФЛАГШТОК


Плошча сцяга. Баку

Сур'ёзная барацьба пачынаецца за права валодаць самым высокім флагштокам у свеце. У Таджыкістане збіраюцца выдаткаваць на гэта мільёны долараў. Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмонаў на святе нацыянальнага Дня сцягу 24 лістапада заявіў пра пачатак будаўніцтва 165-метровага флагштока ў сталіцы краіны — Душанбе.Такім чынам, самая бедная краіна Цэнтральнай Азіі, дзе сярэдняя гадавая зарплата складае каля 650 долараў, імкнецца парушыць статус багатага нафтай Азербайджана, уладальніка самага высокага сцяга ў свеце. У верасні 2010 года ў сталіцы Азербайджана Баку быў адкрыты 162-метровы флагшток з нацыянальным сцягам. Але хутка рэкорд Баку будзе пабіты таджыкамі. Флагшток у Таджыкістане таксама паб'е паказчык суседняга Туркменістана — папярэдняга рэкардсмена, дзе ў 2008 годзе паставілі 133-метровы флагшток. Пра кошт туркменскага праекта нічога не вядома. Дарэчы, флагштокманія стала падарункам для дубайскай кампаніі «Trident Support», якая будуе гэтыя канструкцыі.

**Па матэрыялах «Guardian» (Вялікабрытанія)**

### ІСПАНІЯ. ЧАРГОВАЯ СПРОБА

27 лістапада ў Памплоне (правінцыя Навара) адбыўся ўстаноўчы сход новай палітычнай партыі левых нацыяналістаў. Пры гэтым да абмеркавання назвы арганізацыі справа не дайшла. Удзельнікі сходу (іх было каля 300) абмежаваліся тым, што сфармулявалі патрабаванне — незалежнасць Краіны Баскаў, якая павінна стаць сацыялістычнай дэмакратычнай дзяржавай, дзе паважаюцца правы жанчын. Па-сутнасці сустрэча ў Памлоне з'яўляецца чарговай спробай сяброў забароненай партыі «Batasuna» ўвайсці ў палітыку. Пасля забароны партыі нацыяналісты некалькі разоў спрабавалі заснаваць новую структуру, аднак ва ўсіх выпадках улады адмаўлялі ім. Цяперашняя ініцыятыва, відавочна, звязаная з новым грамадскім кліматам, які склаўся пасля заявы ЕТА пра часовую адмову ад баявых дзеянняў. У нацыяналістаў з'явілася надзея, што цяпер іх могуць легалізаваць.

**Па матэрыялах «GARA» (Іспанія)**

### ПОЛЬШЧА. ЗЯЛЁНЫЯ ЎПЕРШЫНЮ ВА ЎЛАДЗЕ

Па выніках мясцовых выбараў партыя «Зялёныя–2004» упершыню ў сваёй гісторыі трапіла ў органы мясцовага самакіравання. Эколагі атрымалі мандаты ў рэгіянальных сеймах Сілезіі, Памор'я, а таксама прайшлі ў органы самакіравання Варшавы і Вроцлава. Навіна пра перамогу «Зялёных–2004» цікавая, паколькі сама партыя на момант стварэння ўяўляла незвычайны кангламерат эколагаў, феміністак і аматараў незалежнага кіно. Першае, што зрабілі «Зялёныя–2004», — падтрымалі ідэю правядзення Маршаў вольнасці (гей-парады) у сталіцы, пасля чаго шмат хто паставіў на іх праекце крыж. Аднак у выніку працы маладая партыя здолела знайсці шлях да выбаршчыкаў. Праўда, пакуль пра канчатковы выхад «Зялёных–2004» на польскую палітычную сцэну казаць рана. Ва ўсе згаданыя вышэй саветы «Зялёныя–2004» прайшлі па спісах, дзе таксама прысутнічалі кандыдаты ад партыі Саюз Левых Дэмакратаў. Дарэчы, адзін з зялёных дэпутатаў стаў першым у гісторыі Польшчы дэпутатам-геем.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### ШВЕЦЫЯ. ЛАПЛАНДЦЫ — АСОБНЫ НАРОД

Швецыя прызнала, што саамы (іншая назва — лапландцы) — асобная нацыя, а не «этнічная або рэлігійная меншасць». Такое рашэнне прыняў парламент краіны. Адпаведныя змены будуць унесены ў тэкст канстытуцыі. Саамы, або лапландцы, — гэта аўтахтонны народ, які жыў на поўначы цяперашняй Швецыі яшчэ да прыходу саміх шведаў. Саамы таксама жывуць у Расіі, Нарвегіі і Фінляндыі. Агульная колькасць саамаў каля 70–75 тысяч чалавек. Яны ловяць рыбу і разводзяць аленяў. Тое, што саамы атрымалі статус асобнага народу, адчыняе перад імі шырокія далягляды. Нават шведскія юрысты прызнаюць, што яны могуць патрабаваць не толькі шырокай аўтаноміі, аднак нават стварэння сваёй дзяржавы.

**Па матэрыялах «PAP» (Польшча)**

### КАЗАХСТАН. УСЕ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ МОВУ

Апублікаваны праект закону, адпаведна якому да 2020 года кожны дарослы грамадзянін Казахстану павінен размаўляць на казахскай мове. На цяперашні час толькі 60 працэнтаў з 15 мільёнаў жыхароў краіны ведаюць мову тытульнай нацыі. Пры гэтым казахі складаюць 65 працэнтаў насельніцтва дзяржавы. Трэба таксама згадаць, што 85 працэнтаў казахаў карыстаюцца рускай мовай. Праект «Дзяржаўнай праграмы функцыянавання і развіцці моваў на 2011–2020 гады» ставіць задачу давесці колькасць людзей, якія валодаюць казахскай мовай, да 95 працэнтаў, захаваўшы пры гэтым веданне насельніцтвам рускай мовы на ўзроўні 90 працэнтаў. Стаўка будзе рабіцца на тое, каб (як гаворыцца ў тэксце праграмы) «сфармаваць уяўленне пра тое, што веданне казахскай мовы — гэта прыкмета паспяховасці, волі, дасканаласці і прафесійнай перавагі».

**Па матэрыялах «Евразиянет» (Казахстан)**

▸ РЭЛІГІЯ

# НАБАЖЭНСТВА ПА-КАЗАХСКУ

**Алег НОВІКАЎ**




**Ідэя праваслаўнай царквы Казахстана праводзіць набажэнствы на казахскай мове выклікала шырокую грамадскую дыскусію наконт таго, якому Богу павінен маліцца казах.**

«Сёння ў Праваслаўнай царкве Казахстана вырашаецца пытанне пра ўжыванне казахскай мовы ў набажэнстве», — паведаміў на днях мітрапаліт Астанайскі і Казахстанскі Аляксандр падчас «прамой лініі» з чытачамі газеты «Вячэрні Алма-Аты». — У недалёкай будучыні ў храмах, дзе моляцца вернікі, для якіх роднай мовай з'яўляецца казахская, цалкам магчыма, будуць набажэнствы на дзвюх мовах — царкоўнаславянскай і літаратурнай казахскай».

Па словах Яўгена Іванова, кіраўніка прэс-службы епархіяльнага кіравання мітрапаліцкай акругі Казахстана, «казахізацыя» праваслаўя — гэта адэкватная рэакцыя на наяўнасць праваслаўных казахаў. «Ёсць казахскія сем'і, дзе праваслаўе — гэта традыцыйная рэлігія», — кажа святар. Пры гэтым ён намякнуў, што пераход вернікаў на казахскую мову замовіў сам Нурсултан Назарбаеў. «Мы, Праваслаўная царква Казахстана, павінны, сыходзячы з волі прэзідэнта, таксама ісці ў нагу з часам і ўжываць казахскую мову», — дадаў Яўген Іваноў.

Заява Іванова стала бомбай. Фішка ў тым, што праваслаўе не з'яўляецца традыцыйнай рэлігіяй казахаў. У рамках арабскай экспансіі тубыльцы прынялі іслам. Праваслаўе з'явілася ў Казахстане толькі з пачаткам рускай каланізацыі ў XVIII стагоддзі, галоўным чынам на поўначы. У 1871 годзе была створаная Туркестанская епархія, якую ўзначаліў іерарх Сафоній (Сакольскі).Таксама ў Сяміпалацінску дзейнічала спецыяльная «кіргізская місія», якая спрабавала прывесці да праваслаўя мясцовых жыхароў.

У любым выпадку, праваслаўе з'яўляецца пераважна рэлігіяй этнічных рускіх. Яны складаюць абсалютную большасць 5-мільённай праваслаўнай грамады Казахстана.

Таму ідэю набажэнстваў у праваслаўнай царкве на казахскай мове шмат хто тлумачыць як замах на нацыянальную традыцыю. Так, намеснік галоўнага муфтыя Казахстана лічыць, што прадстаўнікам іншых рэлігій, акрамя ісламу, не варта праводзіць у Казахстане набажэнствы на казахскай мове. Гэта думка папулярная сярод часткі нацыянальнай інтэлігенцыі. Так, карыстальнік Бек-батыр на форуме сайту казахскай службы «Радыё Свабода» адзначае: «Нашы дзяды пісалі на арабскай мове, ведалі яе, затым нас перавялі на лацінку і потым на кірыліцу. Трэба трымацца далей ад маскалёў».

Іншыя лічаць, што такі крок, наадварот, пашырыць сферу ўжывання казахскай мовы, што, у сваю чаргу, вельмі добра. Напрыклад, старшыня Саюза мусульман Казахстана Мурат Целібекаў мяркуе, што ў праваслаўным набажэнстве на казахскай мове «няма нічога дрэннага».

Аднак не ўсё так проста з тэзісам пра тое, што нацыянальнай альтэрнатывай праваслаўнай экспансіі з'яўляецца іслам. Прынамсі ў яго цяперашнім варыянце.

Гісторык Галым Асланаў піша: «Не сакрэт, што вялікую частку казахаў раздражняе тое, што ў гарадах Казахстана з мегафонаў мінарэтаў пяць разоў на дзень гучыць арабская мова. Хай і яны вядуць набажэнствы на казахскай мове і атрымаюць на гэта фетфу ў Медзіне».

Адразу ажывіліся прыхільнікі паганскага культу, які быў папулярны сярод казахаў да прыходу арабаў, — тэнгрыянства (ад тэнгры — бог).

Толькі ў сярэдзіне XIII стагоддзя залатаардынскі хан Берке (брат Батыя, які верыў у тэнгры) афіцыйна прыняў іслам. У 1312 годзе ўлада ў Залатой Ардзе перайшла да хана Узбека, які абвясціў іслам дзяржаўнай рэлігіяй. Прыхільнікі тэнгрыянства выступілі супраць. Яны былі забітыя або збеглі на Русь.

Па-сапраўднаму ісламу адкрылася дарога ў Стэп толькі ў XVIII стагоддзі, пасля ўваходжання Казахстана ў склад Расіі (1731 г.). Імперыя жадала мець у сваім падданстве не качэўнікаў, а аселых пастухоў. Быў распрацаваны грандыёзны план прымусовага пераводу казахаў ад качавога ладу жыцця да аселасці. З гэтай мэтай у Стэп, па адмысловым указе імператрыцы Кацярыны II, былі пасланы сотні татарскіх мулаў, якія былі на службе ў Расійскай Імперыі. Разлік быў просты — іслам дыктуе аселы лад жыцця. Ісламізацыя суправаджалася знішчэннем традыцыйнай тэнгрыянскай культуры.

Але нягледзячы на ўсё гэта нават у сярэдзіне XIX стагоддзя іслам асцярожна знаходзіў прызнанне ў Стэпу. Іслам стаў казахскай рэлігіяй толькі ў XX стагоддзі, аднак палеміка, як бачым, працягваецца.

У апошнія гады з'явіўся рух за так званы «казахскі іслам» ці «ясаўізм». Разглядаючы артадаксальны іслам як форму арабскага шавінізму і экспансіянізму, паслядоўнікі новага руху спрабуюць укараніць паняцце «казахскага ісламу», які ўбірае ў сябе і асноўныя догмы арабскага ісламу, і традыцыйныя вераванні казахаў.

Праціўнікі гэтай канцэпцыі вінавацяць яе прыхільнікаў у «шматбожжы». Адзін з іх адзначае: «Што дрэннага ў тым, каб мы ведалі арабскую мову? Гэта адна з сусветных моваў, на ёй размаўляе ўвесь Блізкі Усход, Паўночная Афрыка. Давайце пачнём паступовы пераход на арабскі шрыфт, мы будзем бліжэй да братоў па рэлігіі, будзем вывучаць арабскую мову, гэта ўзбагаціць наш свет».

Вось такая дыскусія.

Самае цікавае, што праваслаўныя вельмі насцярожана паставіліся да таго, што царкоўнае казанне будзе гучаць на казахскай мове. На іх думку, прыход у храм мовы тутэйшых жыхароў азначае паступовую падрыхтоўку да стварэння казахскай аўтакефаліі. Аднак супрацьстаяць працэсам ні яны, ні святары не здольныя. На ўсё, як кажуць, воля прэзідэнта!



«Казах з казахам размаўляйце на казахскай мове». Шыльда ў санаторыі ў Алма-Аце

МЕРКАВАННЕ




# ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ПРАТЭСТУЮЦЬ

**У Кіеве на Майдане зноў стаяць намёты. Прадпрымальнікі пратэстуюць супраць новай рэдакцыі Падатковага кодэксу, а газеты спрачаюцца, ці перарастуць гэтыя пратэсты ў нешта іншае. Пра асаблівасці новага Майдану журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з кіеўскім палітолагам Юрыем Дакукіным.**

***— Чаму прадпрымальнік выйшлі на вуліцу?***

— Тут ёсць дзве супярэчнасці. Пачаць трэба з таго, што новы Падатковы кодэкс — гэта не справа злога Януковіча. Урад кіруецца інструкцыямі Міжнароднага валютнага фонду, які за крэдыты настойвае на фінансавай і бюджэтнай дысцыпліне. У тым ліку МВФ патрабаваў разабрацца з падатковым хаосам. Новы падатак для прадпрымальнікаў на самай справе не такі ўжо і вялікі: ён складае некалькі сотняў грыўняў. Аднак тут сваю справу зрабілі апазіцыйныя паліттэхнолагі. Гэта другая супярэчнасць, паколькі апазіцыя ў нас быццам празаходняя і шануе міжнародныя фінансавыя інстытуты.

***— Вы лічыце, што пратэсты на Майдане з'яўляюцца справай каманды Юліі Цімашэнка?***

— Цяперашнія пратэсты зроблены пад адну капірку з іншымі пратэстамі Юліі. Пасля прыходу Януковіча да ўлады апазіцыя рэгулярна спрабуе справакаваць нейкія масавыя акцыі на сацыяльную тэматыку, каб пасля надаць ім палітызаваны антыўрадавы фармат. Па такой формуле праходзіла кампанія за адстаўку міністра адукацыі Дзмітрыя Табачніка. Пасля была кампанія супраць новай рэдакцыі Працоўнага кодэксу, якую народ не зразумеў, паколькі і па старому кодэксу ў нас ніхто не працуе. Калі вы паглядзіце на склад ініцыятыўных груп тых кампаній, вы лёгка знойдзеце прозвішчы людзей, якія сёння кіруюць ініцыятывамі бізнесменаў.

***— Аднак акцыі прадпрымальнікаў маюць сапраўды больш масавы характар, чым «антытабачная кампанія» або кампанія супраць новага Працоўнага кодэксу.***

— У 1990-я гады з-за эканамічнага калапсу вялікі працэнт украінцаў пайшоў у прыватны бізнес. Дасюль ІП — гэта масавая з'ява. Таму пратэсты прадпрымальнікаў сапраўды выклікалі жывы інтарэс. Аднак пасля таго, як у лагеры пачалі з'яўляцца рознага кшталту палітыкі, народ заняў абыякавую пазіцыю. Акрамя таго, маніфестанты ігнаруюць праблемы бюджэтнікаў, якія баяцца, што з-за адсутнасці падаткаў у бюджэце ім не будуць плаціць заробкі.

***— Ці былі ў арганізатараў Майдану спробы надаць пратэстам больш шырокую сацыяльную базу?***

— Так. Апазіцыя актыўна прасоўвае лозунг пра тое, што на праблему прадпрымальнікаў трэба глядзець у комплексе. Гэта дэманстрацыя таго, як буйны капітал у выглядзе Партыі Рэгіёнаў вырашае праблемы за кошт іншых сацыяльных груп. Тут ёсць рацыя. Аднак наўрад ці самі прадпрымальнікі жадаюць такой пастаноўкі пытання і нават прыняцця больш масавых саюзнікаў. Напрыклад, яны адмовіліся ад падтрымкі прафсаюзаў. Калі б Федэрацыя прафсаюзаў вывела сваіх сяброў на плошчу, яны б за кошт масавасці навязалі пратэстам новыя лозунгі. Аднак паколькі прафсаюзы ў нас больш праўладныя, натуральна, апазіцыя не хоча іх прысутнасці.

***— Ці ёсць у пратэстантаў нейкі каардынацыйны орган?***

— Зараз лагер не мае адзінага кіраўніцтва, хаця на такую ролю прэтэндуе група «Выратаванне прадпрымальнікаў». На Майдане ёсць і групы, якія падтрымліваюць Януковіча, аднак патрабуюць адстаўкі адыёзных міністраў яго кабінету. Другая пазіцыя — папросту шукаць кампраміс з уладамі. Нарэшце, ёсць ідэя стварэння на хвалі пратэстаў асобнай палітычнай партыі бізнесменаў. Ёсць і аранжавыя, якія мараць пра новы Майдан. Як заявіла Юлія Цімашэнка, Майдан–2 параніў Януковіча, а Майдан–3 даб'е яго. Аднак да сапраўднага Майдану яшчэ вельмі далёка. Гэта адчуваецца па настрою грамадства, па тым, як рэагуе на выступ культурнае асяроддзе, што думае правінцыя, дзе пратэсты вельмі слабыя.

***— Як улада ставіцца да пратэстаў?***

— Рэакцыя накіраваная на тое, каб не дапусціць павялічэння ўдзельнікаў пратэстаў за кошт іншых сацыяльных катэгорый і раскалоць самі мітынгуючых. Медыя, якія блізкія да Партыі Рэгіёнаў, увесь час паказваюць агульны план лагернага гарадку, каб усе пабачылі яго сціплыя памеры. Вельмі ахвотна вядуць рэпартажы з лагеру, калі яго наведвае нейкі палітыкан, які даўно сябе дыскрэдытаваў. Даюць слова рознага кшталту партыйным лідэрам, каб справакаваць канфлікты ў кіраўніцтве прадпрымальніцкага руху.

***— Як адрэагавалі партыі другога эшалону на Майдан–3?***

— Нацыяналісты з аб'яднання «Свобода» падтрымалі акцыі, што, натуральна, прынесла шмат радасці піяршчыкам Партыі Рэгіёнаў. Выява на экране Галічыніна з партрэтамі Бандэры — лепшая гарантыя таго, што прадпрымальнік з Усходняй Украіны пратэст праігнаруе. Падтрымалі пратэсты ўсе партыі былога аранжавага спектру, паколькі іх электаральная вотчына — гэта Цэнтральная і Усходняя Украіна, дзе нямала людзей выжываюць за кошт перапродажу тавараў. У цікавую пастку трапіла Кампартыя, якая ўваходзіць у склад ураду і адначасова дэкларуе сябе абаронцам малых прадпрымальнікаў. Спачатку камуністы асудзілі пратэсты, паколькі іх арганізатары, па іх словах, «невытворчы сегмент бізнесу, спекулянты». Зараз на месцах яны намагаюцца быць больш асцярожнымі.

***— Якімі могуць быць вынікі цяперашніх падзей?***

— Калі б гэтыя акцыі адбыліся напярэдадні мясцовых выбараў 31 кастрычніка, яны б маглі паўплываць на іх вынікі. Падазраю, што іх і рыхтавалі да выбараў, паколькі першыя пратэсты пачаліся ўвосень. Аднак зараз ужо занадта позна, таму заўважна на рэйтынг улады акцыі не паўплываюць. Магчыма, праўда, адбудзецца адстаўка некалькіх міністраў, напрыклад Міхаіла Бродскага. З іншага боку, тое, што прадпрымальнікі дабіліся, каб Януковіч наклаў вета на кодэкс, — добры прыклад для іншых сацыяльных груп. Знак таго, што пратэставаць усё ж варта. Патэнцыйна з-за праблемы новых камунальных коштаў яны будуць гатовыя выйсці на вуліцу. Аднак тут шмат залежыць ад таго, ці зробіць БЮТ высновы з правалу Майдану–3, перш за ўсё, ці прызнае, што тавары старых палітыкаў са старым аранжавым дыскурсам хутчэй адпужваюць людзей.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДАМІНІК СТРОСС-КАН



Французскі сацыяліст, кіраўнік Міжнароднага валютнага фонду, былы міністр па пытаннях эканомікі ў шэрагу сацыялістычных урадаў, нечакана стаў галоўным фаварытам прэзідэнцкіх выбараў, прызначаных на 2012 год. Гэта стала зразумела пасля таго, як ягоная партыя абвясціла выбары партыйнага кандыдата на пасаду прэзідэнта. Галоўных канкурэнтаў было двое: цяперашні партыйны старшыня Марцін Обры і Сегален Руаяль — кандыдат ад сацыялістаў на папярэдніх выбарах прэзідэнта. Сваю кандыдатуру заявіў і Дамінік Стросс-Кан. І вось цяпер нечакана для ўсіх ён стаў лідэрам гонкі. Калі за Сегален і Марцін гатовыя галасаваць не больш за 12 працэнтаў сяброў партыі, Дамінік карыстаецца падтрымкай прыкладна чвэрці партыйцаў. Больш таго, па апытаннях французаў, 60 працэнтаў з іх гатовыя галасаваць за Дамініка Стросс-Кана, калі яго супернікам у другім туры выбараў будзе Нікаля Сарказі, прадстаўнік правага лагеру. Пакуль мала хто цалкам разумее прычыны такога ўздыму папулярнасці Дамініка. Хтосьці кажа, што гэта нейк звязана з тым фактам, што Дамінік Стросс-Кан удзельнічаў ва ўрадах прэзідэнта Франсуа Мітэрана, які ў сваю чаргу з'яўляецца культавай асобай сярод левых. Іншыя кажуць, што ўсё з-за залішняга фемінізму. Быццам нягледзячы на прапаганду роўнасці палоў, Францыя застаецца патрыярхальнай краінай, дзе дамініруе моцны пол. Сацыялісты, абіраючы Дамініка Стросс-Кана як свайго кандыдата, разумеюць: каб перамагчы мужыка Сарказі, патрэбны нейкі іншы мужык.

### ПРАСКОЎЯ КАРАЛЮК



Даярка з сяла Цярнопальскай вобласці, герой рэвалюцыі на Майдане, якую часта звалі баба Параска, памерла на 71-м годзе жыцця ад запалення пазаваночніка. У апошнія дні людзі тэлефанавалі, каб даведацца пра яе самаадчуванне і чаму яна не прыехала ў сталіцу на 6-я ўгодкі Майдана. Сама бабуля таксама рвалася ў Кіеў, каб падтрымаць пратэсты прадпрымальнікаў супраць новага Падатковага кодэксу, аднак у пятніцу нечакана страціла прытомнасць, а пазней на вачах у родных памерла. Пахавалі бабу Параску ў мінулую нядзелю на сельскіх могілках побач з магілай мужа. Праводзіць у апошні шлях гераіню аранжавай рэвалюцыі прыйшлі 200 чалавек. Прыехалі нават з суседніх вёсак. А вось палітычных лідэраў Майдану на пахаванні не было. Гэта акалічнасць дала падставу Партыі Рэгіёнаў абвінавачваць аранжавых у цынізме. А экс-прэзідэнта Віктара Юшчанка бела-сінія СМІ наогул абвінавацілі ў забойстве Каралюк. Здароўе Праскоўі Каралюк, па іх словах, рэзка пагоршылася пасля таго, як у снежні 2008 года яе збіла ахова прэзідэнта Юшчанкі, які раней даў ёй ордэн княгіні Вольгі. Пасля гэтага інцыдэнту баба Параска месяц лячылася ў адным крымскім шпіталю, а затым з'ехала ў лякарню ў сваё роднае сяло, хаця невыносны боль у спіне не праходзіў. У труну бабулі паклалі тую самую аранжавую куртку, у якой яна стаяла на Майдане.

### ЖОАН ЛАПОРТА

Прыхільнік незалежнай Каталоніі, былы прэзідэнт футбольнага клубу «Барселона», зрабіў немагчымае. Ягоная партыя «Solidaritat Catalana per la Independència» па выніках выбараў 28 лістапада атрымала свае прадстаўніцтва ў каталонскім парламенце. Фракцыя «Solidaritat Catalana» будзе складацца з 3 дэпутатаў. Партыя Лапорта — цікавы феномен на мясцовай партыйнай сцэне. Імідж галоўных нацыяналістаў у Каталоніі на працягу 8 апошніх гадоў мела партыя «Рэспубліканская левая Каталоніі» (ERC), якая, аднак, мела на апошніх выбарах самы вялікі ў сваёй гісторыі канфуз (фракцыя ERC скарацілася ў два разы). Чаму тады людзі галасавалі за іншую нацыяналістычную партыю Лапорта? Адказу пакуль няма. Шмат хто лічыць, што гэта звязана з крызісам метадаў прапаганды старых нацыяналістаў, калі стаўка рабілася на прафсаюзы і культурныя акцыі. Цяпер значна большую ролю для нацыянальнай свядомасці адыгрывае спорт. Натуральна, усе галасуюць за палітыкаў, якія з ім звязаныя. А ў трыумфе партыі Лапорты няма нічога дзіўнага: пры ім футбольны клуб «Барселона» двойчы быў уладальнікам Кубку Чэмпіёнаў.



▸ ПАПУЛЯРНАЕ КІНО

# АД АРЛЕКІНА ДА БАЦЬКАЎШЧЫНЫ



Андрэй РАСІНСКІ

**Сёння беларускае кіно не ў лепшай глядацкай форме. Пракат айчынных стужак толькі ажывае. Самі творы не заўжды можна ўбачыць, хаця яны спрабуюць дагрукацца да гледача. А публіка яшчэ не ўпэўнена ў сучасных беларускіх карцінах і падзабыла колішнюю славу «Беларусьфільму».**



Але пра гэту славу варта нагадаць. Расійскі крытык Сяргей Кудраўцаў зрабіў ашчаднае апісанне самых глядацкіх савецкіх карцінаў. Беларускае кіно ў гэтым спісе займае ажно 32 пазіцыі. Так што ў нашай краіне былі стужкі, якія глядзелі мільёны і мільёны.

На жаль, цяжка ацаніць поспех нямых стужак, дакладная статыстыка па якіх не знойдзена. Але з пэўнасцю можна сказаць, што першыя беларускія карціны «Лясная быль», а асабліва стужка з заманлівай назвай «Прастытутка», мелі свайго гледача. «Прастытутку» нават дакаралі за камерцыйнасць.

Па-за разглядам і стужкі для тэлевізіі — «Пра Чырвоную Шапачку», «Прыгоды Бураціна».

Першае месца ў спісе самых глядзельных беларускіх стужак ад 1940-х гадоў займае фільм, зроблены пад заслону савецкай эпохі. Гэта моладзевая перабудовачная драма Валерыя Рыбарава «Мяне клічуць Арлекіна» (1988 год, 2 серыі). На серыю прыпадае 41,9 мільёна гледачоў.

Я быў сведкам таго, як на гэту выкрывальніцкую стужку — з падпольнай рок-музыкай, правінцыйнай нудой, аголенымі грудзямі і выпадковым сексам — рэагавалі ў Хабараўску. У кнізе водгукаў, спісанай ад пачатку і да канца, вылучалася прызнанне губной памадаю: «Глядзела, гляджу і глядзець гэты фільм буду!»

Камедыйную меладраму Ігара Дабралюбава «Белыя Росы» 1984 года пабачыла 36,1 мільёна чалавек. Гэта другое месца ў зале беларускае кінаславы. Была надрукаваная вялікая колькасць кінакопій «Белых Росаў» — 1199.

Трэцяе месца — у ваеннай дзіцячай меладрамы Льва Голуба «Дзяўчынка шукае бацьку» 1959 года. Гэта наогул самы папулярны дзіцячы фільм за ўсе савецкія часы — 35,4 мільёна гледачоў.

Жывыя і непасрэдныя акцёры, вострыя сітуацыі, слёзы і спачуванне гарантавалі гэтай карціне поспех. Яшчэ адна ваенна-прыгодніцкая дзіцячая карціна Льва Голуба ўваходзіць у наш спіс. Гэта «Паланез Агінскага» — на 18-м месцы.

Увогуле, хаця ваенная тэма лічылася істотнай для «Беларусьфільму», гледачы ўпадабалі ваенныя фільмы, калі яны знітоўваліся з прыгодамі і меладрамай. Самы паказальны прыклад — «Гадзіннік спыніўся апоўначы» Мікалая Фігуроўскага пра забойства Кубэ. За авантурныя моманты гэты фільм папракалі. Але стужка атрымала заслужаную любоў публікі.

Страшны ваенны фільм Элема Клімава «Ідзі і глядзі», які паглядзела ў Савецкім саюзе, прынамсі 29,8 мільёна чалавек, амерыканцы ўключылі ў кнігу «1001 фільм, які вы мусіце пабачыць». Фільм меў неблагі пракатны лёс на Захадзе.

На заходніх фэстах прывячалі і «Дзікае паляванне караля Стаха» Валерыя Рубінчыка. Нягледзячы на абмежаваных 486 копій, фільм, які сабраў 11,3 мільёна гледачоў, і дасюль не згубіў сваёй прывабнасці.

А вось пафасна-гераічны «Канстанцін Заслонаў» 1949 года сёння ўяўляе толькі гістарычную цікаўнасць. Аднак у познесталінскія часы было наогул замала стужак, дый настрой фільму адпавядаў эпосе.

Затое інтрыгоўна гучыць назва забытай карціны «Бацька» Барыса Сцяпанава (19,9 мільёна гледачоў). Але гэта толькі пра партызанскага бацьку Міная.

Беларускія класікі — Віктар Тураў і Валерый Рубінчык, якія акурат напрыканцы спісу — саступаюць па папулярнасці ўдалым рамеснікам Сяргею Сплашнову ды Язэпу Шульману. Сплашнова, увогуле, лаялі за безгустоўе і патуранне публіцы, але гэта і падабалася гледачам («Цешча», «Каханнем трэба даражыць»).

Можна кусаць локці, што карціну цікавага аўтара Валянціна Вінаградава «Усходні калідор» катэгарычна забаранілі і не выпусцілі ў пракат. Затое ягоную стужку «Дзень, калі мінае 30» пабачыла 22,8 мільёна гледачоў.

Увогуле, спіс самых папулярных беларускіх карцінаў ушчэнт разбівае стэрэатып, што кіно па беларускіх кнігах ці на беларускай мове непапулярнае. Коласаўскія «Першыя выпрабаванні» паводле «На Ростанях» паглядзела 27,2 мільёна чалавек, «Паўлінку» — 20 мільёнаў гледачоў (праўда, гэта 1952 год), «Людзі на балоце» — 4,1 мільёна.

А чорна-белая (!) нетаропкая і вельмі аўтарская экранізацыя Вячаслава Адамчыка «Чужая бацькаўшчына», зробленая Валерыем Рыбаравым, сабрала 800 тысяч удзячнай публікі.

У айчынным кіно вылучаюцца дзве «найпапулярнейшыя» эпохі — канец 1950-х і канец 1980-х. Раз у 30 гадоў гледачы штурмавалі кінатэатры, каб паглядзець беларускія стужкі. І выглядае на тое, што неўзабаве можа пачацца новы пік.

А пакуль беларускія карціны згубілі расійскі рынак, а заходні не набылі. Студыя не здольная прадаць уласныя стужкі. «Масакра» Андрэя Кудзіненкі, якая наблага ідзе ў кінатэатрах, аддрукаваная ўсяго ў колькасці 8 (!) копій.

Але ёсць гістарычны прыклад папулярнага беларускага кіно. Варта толькі памятаць і быць чулым да эпохі і гледачоў.

## Даведка:




**Папулярныя беларускія фільмы (паводле Сяргея Кудраўцава)**

*Колькасць гледачоў — толькі па Савецкім Саюзе*

«Мяне клічуць Арлекіна», 1988 год, моладзевая драма Валерыя Рыбарава, 41,9 млн. гледачоў на серыю.

«Белыя Росы», 1984 год, меладрама-камедыя Ігара Дабралюбава, 36,1 млн. гледачоў, 1199 кінакопій, 30 108 гледачоў на кінакопію.

«Дзяўчынка шукае бацьку», 1959 год, ваенная дзіцячая драма Льва Голуба, 35,4 млн. гледачоў.

«Гадзіннік спыніўся апоўначы», 1959 год, ваенны героіка-прыгодніцкі фільм Мікалая Фігуроўскага, 34,8 млн. гледачоў.

«Каханнем трэба даражыць», 1960 год, сацыяльная меладрама Сяргея Сплашнова, 33,9 млн. гледачоў.

«Чорная бяроза», 1978 год, ваенны кінараман Віталя Чацверыкова, 33,3 млн. на серыю, наклад 1082 копіі.

«Чырвонае лісце», 1958 год, героіка-прыгодніцкая драма Уладзіміра Корш-Сабліна, 33,1 млн. гледачоў.

«Пагаворым, брат» (пры ўдзеле «Масфільму»), 1979 год, гісторыка-рэвалюцыйны прыгодніцкі фільм Юрыя Чулюкіна, па 32,8 млн. на серыю, наклад 1108 копій, 29 633 гледача на копію.

«Ідзі і глядзі» (пры ўдзеле «Масфільму»), 1986 год, ваенная трагедыя Элема Клімава, па 29,8 млн. на серыю, накладам 925 копій, 32 216 гледачоў на копію.

«Годны ў нестраявыя», 1969 год, ваенна-гераічная камедыя Уладзіміра Рагавога, 27,9 млн. гледачоў, наклад 1370 копій, 20 365 гледачоў на копію.

«Цешча», 1974 год, сацыяльная камедыя Сяргея Сплашнова, 27,4 млн. гледачоў, наклад 929 копій, 29 494 гледача на копію.

«Першыя выпрабаванні», 1960 год, гісторыка-рэвалюцыйны фільм Уладзіміра Корш-Сабліна паводле раману «На Ростанях» Якуба Коласа, 1-я серыя, 27,2 млн. чалавек.

«Нашы суседзі», 1957 год, сацыяльная моладзевая аповесць Сяргея Сплашнова з элементамі меладрамы, 27 млн. гледачоў.

«Наперадзе круты паварот», 1960 год, крымінальна-псіхалагічная драма Рычарда Віктарава, 24,9 млн. гледачоў.

«Дзень, калі мінае 30», 1962 год, псіхалагічная драма Валянціна Вінаградава, 22,8 млн. гледачоў, наклад 942 копіі, 24 204 гледача на копію.

«Чалавек не здаецца», 1961 год, ваенная гераічная драма Іосіфа Шульмана, 22,7 млн. гледачоў, наклад 714 копій, 31 793 гледача на копію.

«Пункт адліку», 1980 год, героіка-сацыяльная аповесць Віктара Турава, 22,5 млн. гледачоў на 1267 копій, 17 758 гледача на копію.

«Паланез Агінскага», 1972 год, дзіцячы ваенны героіка-прыгодніцкі фільм Льва Голуба, 22,2 млн. гледачоў, наклад 1579 копій, 14 060 гледачоў на копію.

«Сын старшыні», 1976 год, сацыяльная аповесць Вячаслава Нікіфарава, 20,2 млн. гледачоў, наклад 1219 копій, 16 571 гледач на копію.

«Паўлінка», 1952 год, фільм-спектакль Аляксандра Зархі паводле аднайменнай камедыі Янкі Купалы, 20 млн. гледачоў.

«Бацька», 1972 год, партызанская драма Барыса Сцяпанава, 19,9 млн. гледачоў, 620 копій, 32 097 гледачоў на копію.

«Мая любоў», 1940 год, камедыйная меладрама Уладзіміра Корш-Сабліна, 19,2 млн. гледачоў.

«Чужое імя», 1966 год, псіхалагічны дэтэктыў Іосіфа Шульмана, 18,7 млн. гледачоў, 1054 копіі, 17 742 гледача на копію.

«Канстанцін Заслонаў», 1949 год, ваенна-гераічны фільм Аляксандра Файнцымера, 17,9 млн. гледачоў.

«Праз могілкі», 1965 год, ваенны фільм Віктара Турава, 11,8 млн. гледачоў, 896 копій, 13 170 гледачоў на копію.

«Дзікае паляванне караля Стаха», 1979 год, гатычны дэтэктыў Валерыя Рубінчыка, 11,3 млн. на серыю, 486 копій, 23 251 гледачоў на копію.

«Час яе сыноў», 1976 год, ваенны фільм Віктара Турава, 8,6 млн. гледачоў, 867 копій.

«Я родам з дзяцінства», 1967 год, ваенная кінааповесць Віктара Турава, 7,6 млн. гледачоў, 504 копіі, 15 079 гледачоў на копію.

«Людзі на балоце», 1982 год, кінараман Віктара Турава, 4,1 млн. гледачоў, 453 копіі, 9 051 глядач на копію.

«Наш бронецягнік», 1989 год, перабудовачная драма Міхаіла Пташука, 2,8 млн. на серыю.

«Культпаход у тэатр», 1983 год, лірычная трагікамедыя Валерыя Рубінчыка, 2,5 млн. гледачоў, 682 копіі, 3 666 гледачоў на копію.

«Чужая бацькаўшчына», 1983 год, кінараман Валерыя Рыбарава, 0,8 млн. гледачоў, 152 копіі , 5 263 гледача на копію.

▸ РЭЦЭНЗІЯ

# РЭЙГАН ВЯРТАЕЦЦА З ДЗЕЦЬМІ-ВАМПІРАМІ

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Паўторная экранізацыя шведскага раману пра дзяцей-крывасмокаў здзіўляе Рональдам Рэйганам і вяртаннем студыі «Хамэр». Можна даць тры зорачкі за амерыканскі фільм «Упусці мяне. Сага».**

Халоднай зімой 1983 года маленькі Оўэн, з якога здзекуюцца аднакласнікі, закахаўся ў новую суседку па дому. Але дзяўчынка — вампірка, і на хлопчыка ў яе свае планы.

Пасля таго, як шведскі рэжысёр Томас Альфрэдсан зрабіў з падлеткава-крывавай гісторыі меланхалічны шэдэўр пра сталенне, эстафету пераймялі амерыканцы на чале з Мэтам Рыўзам. Амерыканская стужка — больш жорсткая, з узмоцненым маральным рыгарызмам — і ўвідавочненай праявай зла (рэй вядзе юная Хлоя Морэц).

Але фільм цікавы вяртаннем студыі «Хамэр», якая ў 1960-я праславілася «Дракуламі» і «Муміямі» і доўга не падавала прыкметаў жыцця. Цяпер яна вяртаецца ў кінапалітыку.

Другое вяртанне — яшчэ цікавейшае. На экране — Рональд Рэйган, прэзідэнт-хрысціянін, які прапаведуе пра зло. Фільм напалохаў караля жахаў Стывена Кінга. Пасля канвульсіўна-постмадэрнісцкіх гадоў гэта новы сюжэт.

Зло вырастае на духоўнай халаднечы. Не пускайце яго ў сваё сэрца.

ГАДАВІНА

# РЫГОРУ КОБЕЦУ — 110

Сёлета споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага драматурга, кінасцэнарыста і тэатральнага дзеяча Рыгора Кобеца. І ўжо прайшло 20 гадоў, як ён пайшоў ад нас у іншы свет. Яго жыццё хопіць на некалькі прыгодніцкіх раманаў, драм і трагедый. Такі яму выпаў час. Такім быў яго характар. Юнацтва — праз полымя дзвюх рэвалюцый і грамадзянскай вайны, пад свіст ідэй і куль. Пратэст і пошук праўды. Анархісцкая суполка, Аўстрыйскі фронт, войска Махно… І покліч талента да пяра, які перамагаў усё. З 1920-х гадоў — у Беларусі: качагар, рабкор, журналіст, паэт, пісьменнік і драматург. Да вяршынь. І… да ГУЛАГа.

Першы прафесійны кінадраматург, аўтар першага гукавога і першага беларускамоўнага фільма «Двойчы народжаны», аўтар сусветна вядомай кінакамедыі «Шукальнікі шчасця» і іншых таленавітых твораў.

У 1935 годзе ён першы з беларускіх пісьменнікаў (разам з Анатолем Вольным) атрымаў званне заслужанага дзеяча мастацтваў за вялікі ўклад у станаўленне і развіццё беларускага кіно. А ў 1938-м — рэпрэсаваны. 22 гады — у лагерах і ссылках. Поўнасцю рэабілітаваны толькі ў 1960 годзе.

2010-ы юбілейны год можна лічыць шчаслівым у творчай біяграфіі напаўзабытага пісьменніка. Нядаўна ўбачыла свет кніга яго выбраных твораў, выдадзеная ў серыі «Беларускі кнігазбор», у якой упершыню надрукаваны яго кінасцэнары.

4 лістапада музей Янкі Купалы адзначыў 110-ю гадавіну з дня нараджэння Рыгора Кобеца. Супрацоўнікі музея назвалі гэта свята «Шукальнік шчасця». Напярэдадні стала вядома, што ў снежні да Дня работнікаў беларускага кіно БТ плануе паказаць фільм «Шукальнікі шчасця». Фільм, які і праз 75 гадоў пасля выхаду на экраны застаецца цікавым для сучаснага гледача. І вакол якога віруюць новыя жарсці. Такое вось парадаксальнае пацвярджэнне мастацкай вартасці даўняй кінастужкі, знятай па сцэнару Рыгора Кобеца.

Пра фільм і яго новыя прыгоды — аповед дачкі драматурга. Са згоды аўтара друкуем у скарачэнні.



Алена Рыгораўна і Рыгор Якаўлевіч на VI з'ездзе беларускіх пісьменнікаў. Красавік 1971 г.




Кінаафіша фільма «Шукальнікі шчасця». 1962 г.



Рыгор Кобец. 1930 г.




Даведка аб поўнай рэабілітацыі Р. Кобеца. 28 лістапада 1960 г.
Ілюстрацыі ўзяты з кнігі Алены Кобец-Філімонавай «Калі ўцякала сонца», Мінск, «Кнігазбор», 2006

## ЗАЛАТАЯ ЖЫЛА

Алена КОБЕЦ-ФІЛІМОНАВА

**«Пиня ехал, Пиня шел, Пиня золото нашел». Гэту песеньку прыдумалі кінагледачы пра свайго любімага героя Піню з сатырычнай кінакамедыі «Шукальнікі шчасця».**

1928 год. З розных раёнаў Савецкага Саюза і нават з-за мяжы едуць на Далёкі Усход яўрэі-перасяленцы будаваць новую радзіму, савецкі Бірабіджан (Яўрэйскую аўтаномную вобласць). Іосіф Сталін выдзеліў для гэтай будоўлі дзікія, неапрацаваныя таежныя землі на беразе Амура.

Ніхто не ведаў, што Сталін задумаў на гэтай зямлі заснаваць ВПЛ (выхаваўча-працоўны лагер) для "дэкласаванай нацыі", якая быццам бы не прыносіць ніякай карысці дзяржаве. У другой палове 1930-х гадоў, калі пачнецца «вялікі тэрор» (1937–1938), ужо будуць пабудаваныя адна турма і чатыры лагеры. Напрыканцы 1940-х пад выглядам барацьбы з касмапалітызмам закрыюць яўрэйскі тэатр, яўрэйскія школы, спаляць кнігі на ідыш, сінагогу. Адначасова арышты і расстрэлы бязвінных людзей. Але напачатку 1930-х гадоў пра запланаваны Сталінам генацыд ніхто не ведаў.

Не ведалі гэтага і аўтары кінафільма «Шукальнікі шчасця», і таму абвінавачваць іх у лакіроўцы рэчаіснасці нельга. У першых варыянтах сцэнарыя былі эпізоды і рэплікі, якія не прапусціла цэнзура.

Дык пра што гэты фільм? Пра адну яўрэйскую сям'ю, сям'ю старой Двойры, якая ў пошуках шчасця пакінула мяжу аселасці вялікадзяржаўнай Расіі, маленькае яўрэйскае мястэчка ў Літве. Блукаючы па свеце, сям'я апынулася ў Палесціне, але і там не знайшла свайго шчасця, і паехала ў савецкі Бірабіджан. Сям'я працуе ў калгасе «Ройтэ Фэлд» («Чырвонае поле»). І толькі Піня працаваць у калгасе не захацеў, і тайна ад усіх шукаў у тайзе золата. Аднак яго мара — разбагацець і купіць за мяжой фабрыку падцяжак — лопнула як бурбалка.

Піня — галоўны герой фільма. Піня Копман, «кароль падцяжак». Вакол гэтага вобраза і зараз не сціхаюць спрэчкі. Адны крытыкі па-ранейшаму лічаць яго дармаедам, іншыя трактуюць гэты вобраз па-новаму. Адзін украінскі літаратуразнаўца сказаў: «Дажыві Піня да нашых дзён, ён стаў бы ўсімі паважаным камерсантам».

Вобраз Піні ў выкананні артыста Веньяміна Зускіна (расстралянага ў 1952-м) — самы яркі ў сцэнарыі і ў фільме. Яго рэплікі сталі крылатымі выслоўямі: «Мой арганізма не прымае цяжкай працы», «У мяне галава, і аба мне не турбуйцеся»...

І ў мінулыя гады, і сёння большасць усприймае гэты фільм як вясёлую кінакамедыю. Глядач палюбіў Піню — маленькага няшчаснага чалавека, які выклікае спачуванне і смех адначасова. Акрамя Піні, у фільме цэлы шэраг яркіх вобразаў — наўдачлівы жаніх, улюбчывы таўсцяк Шлёма, маці вялікай сям'і, якая кранае сваёй чуллівасцю і ў горы, і ў радасці.

Фільм стаў сусветна вядомым. Поспех яго тлумачыцца перш за ўсё таленавітым сцэнарам (Рыгор Кобец, сааўтар яго вучань Іаган Зельцар), рэжысурай (У. Корш-Саблін), гульнёй артыстаў і музыкай Ісаака Дунаеўскага.

Сцэнарый надрукаваны на 5 мовах: на ідыш, на рускай, англійскай, французскай і беларускай (у кнізе «Рыгор Кобец. Выбраныя творы», выдадзенай у снежні 2009 г. у выдавецтве «Беларускі кнігазбор»). Гэта першая публікацыя сцэнарыя ў Беларусі (у маім перакладзе з рускай мовы). Фільм перажыў сваіх аўтараў, і гэта дае права называць яго класічным.

***

Пасля выхаду фільма на экраны прайшло 74 гады, а шукальнікаў шчасця накшталт Піні не стала менш. Адзін з іх патэлефанаваў мне ў лютым 2010 года. Прадставіўся: Ігар Якаўлевіч Афанасьеў, тэатральны рэжысёр з Кіева. Яму 56 гадоў, жыве ў ЗША. Рускі тэатр ставіць пастаноўку «Шукальнікі шчасця» па кінасцэнарыі майго бацькі, які ён знайшоў інтэрнэце. Рэпетыцыі ў самым разгары.

— Мы дадзім другое жыццё «Шукальнікам шчасця». Нешта дадалі сваё. Прэм'ера адбудзецца ў канцы красавіка ў Благавешчанску (на Далёкім Усходзе).

Яго цікавіць, ці ёсць у мяне дакумент, які пацвярджае мае правы на літаратурную спадчыну Рыгора Кобеца. Пачуўшы ў адказ, што такі дакумент, завераны натарыусам, у мяне ёсць, хуценька развітаўся, паабяцаўшы:

— Я буду вам званіць.

Прайшоў амаль год. Рэжысёр Афанасьеў мне так і не пазваніў. На маім рахунку ў банку і сёння пуста. А 18 чэрвеня мая знаёмая атрымала ліст з ЗША ад сваячкі. У ім: «*Здесь прошла реклама на ТВ. В июне приезжает в Нью-Йорк Амурский драмтеатр на гастроли с одним спектаклем «Искатели счастья». А посвящен этот фильм 110-летию со дня рождения И. Дунаевского. Об авторах самой пьесы (во всяком случае в этой рекламе) — ни слова. Музыка, конечно, замечательная, но ведь были и авторы текста. Может быть, в афишах они указаны будут*».

А з лютага месяца ў інтэрнэце мноства рэклам, ухваляючых аўтара п'есы «*Шукальнікі шчасця*» *І. Афанасьева ў пастаноўцы Амурскага тэатра, яго «геніяльныя рэжысёрскія знаходкі»*, і нічога пра сапраўдных аўтараў кінасцэнарыя, пакладзенага ў аснову гэтай п'есы, а больш дакладна, знявечанага сцэнарыя. Афанасьеў і сам піша: «…*Это даже не пьеса, это, скажем, такое ревю по фильму, по сюжету пьесы, по музыке Дунаевского, это такой специфический жанр*». У п'есу ўціснуты музыка і песні Дунаеўскага з іншых фільмаў.

Вернемся ў інтэрнэт. Ён аж стракаціць рэкламамі. І дэзінфармацыяй:

«…*Мелодии из кинофильма «Искатели счастья» никогда не исполнялись ни по радио, ни по телевидению*».

«*Премьера фильма состоялась в 1936 году, и «Искатели счастья» тут же оказались под запретом*» …

Усё няпраўда! У 1936 годзе карціна не была забаронена. Яна з трыумфам пайшла па ўсім свеце. У Ізраілі нават пазыўнымі радыёстанцыі была мелодыя песні Дунаеўскага «На рыбалке, у реки». Беларускі кінасцэнарыст П. Шамшур прыгадваў: «Шукальнікі шчасця» вось ужо 30 гадоў не сыходзяць з экрана, уваходзячы ў рэдкую шарэнгу бессмяротных кінатвораў».

Першы раз фільм быў забаронены пасля арышту Кобеца. Другі раз — пасля забойства Міхоэлса і Зускіна ў пасляваенныя гады. У 1960-м рэабілітаваны разам з Кобецам і паказаны на экране ў 1962 годзе. Яшчэ адна забарона была ў 1969 годзе, пасля «хрушчоўскай адлігі», у час застою. У 1987 годзе, калі адбылася перабудова, фільм быў адноўлены на кінастудыі імя М. Горкага. У 2007 годзе запісаны на дыск (Масква. ООО «Компания Восток В». Пад рубрыкай «Энциклопедия «Мастера кино»).

Якую выснову я зрабіла, прачытаўшы ў інтэрнэце яўна прадуманыя інсінуацыі? Каму гэта трэба і навошта? Гэта своеасаблівая навука, як стаць першым. Дастаткова запэцкаць пачынальнікаў ці проста замоўчваць іх поспехі, скарыстаўшы іх заслугі, каб самім ускараскацца на тэатральны Алімп.

…Пэўна і таму сціраецца прозвішча Кобеца, каб яго наследнікам не дасылаць ганарар.

Ці не нагадвае Афанасьеў Піню з «Шукальнікаў шчасця»? Розніца ў тым, што сучасны амерыканскі Піня знайшоў сапраўдную золата, а больш дакладна, залатую жылу.

Ці не мною адноўлены кінасцэнарый трапіў яму ў інтэрнэце з літаратурнага альманаха «Год за годом»?

У інтэрнэце спектакль Афанасьева названы «культурным подзвігам». А мне яго ўчынак у адносінах да родных Кобеца і да стваральнікаў фільма падаўся бескультурным. Такой непавагі не заслужыў ніхто з нас. Калі грошы памерлага аўтара сцэнарыя яго наследнікам аддаваць шкада, дык хоць бы з п'есай азнаёміў, тым больш, што ў інтэрнэце сказана, быццам стваральнікі фільма сталі героямі спектакля. Якую ролю адвёў рэжысёр Рыгору Кобецу?

За такі подзвіг — плагіят і замах на літаратурную ўласнасць, на спадчыну нацыянальнага мастацтва — раней падавалі ў суд.

**P.S.** У красавіку 1998 года журналіст газеты «Известия» Дзмітрый Філімонаў (унук Рыгора Кобеца) паехаў у Бірабіджан, каб напісаць нарыс аб жыцці сучасных бірабіджанцаў.

«Пытаюся ў губернатара вобласці, — узгадвае Дзмітрый, — ці ён ведае фільм «Шукальнікі шчасця».

— Канешне ведаю. — Губернатар Мікалай Волкаў ідзе ў пакой, што побач з яго кабінетам, і выносіць каробку цукерак. На каробцы намаляваны адзіны ў Бірабіджане кінатэатр («Цэнтральны») з афішай на ім — «Шукальнікі шчасця».

— Перадайце гэтыя цукеркі вашай маці, — кажа губернатар».

▸ З НАГОДЫ

# БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Імя Уладзіміра Караткевіча заўсёды аб'ядноўвала беларусаў. Сёлета, калі грамадскасць адзначае 80-годдзе з дня нараджэння вялікага беларускага пісьменніка, гэта канстанта асобы творцы стала відавочнай.**



Дзяржаўныя ўстановы адна за адной ладзяць выдавецкія і выставачныя акцыі, прысвечаныя юбілею У. Караткевіча, а кампазітары ствараюць усё больш песень на яго вершы. Напрыклад, Дзяржаўны нацыянальны акадэмічны аркестр пад кіраўніцтвам М. Фінберга ў пачатку лістапада прэзентаваў слухачам сваю праграму на вершы Караткевіча.

Не застаюцца ў баку і незалежныя выканаўцы. У сталічным Палацы чыгуначнікаў пры поўным аншлагу адбылася прэзентацыя новага канцэртнага дыска вядомага беларускага выканаўцы Зміцера Вайцюшкевіча «Беларуская песня», на якім прадстаўлены творы на вершы Уладзіміра Караткевіча.

Паэзіяй Караткевіча Вайцюшкевіч-кампазітар захапляецца даўно, з часоў удзелу ў стварэнні альбому «Скрыпка дрыгвы». Пакуль «Скрыпка...» па незалежных ад выканаўца прычынам знаходзіцца ў стадыі выкрышталізацыі, Зміцер стварыў столькі новых песень на вершы класіка беларускага прыгожага пісьменства, што ідэя праграмы і альбому «Беларуская песня» нарадзілася сама сабой.

Прэзентацыя музычнай праграмы Зміцера Вайцюшкевіча на вершы Уладзіміра Караткевіча адбылася ў маі бягучага года. І вось наступны крок — прэзентацыя першага ў дыскаграфіі канцэртнага дыска да юбілею пісьменніка.

Трэба адзначыць, для зачыну музычнага святкавання юбілею пісьменніка Зміцер Вайцюшкевіч выбраў сімвалічны твор Караткевіча — верш «Корчмы», якія насычаны прызнаннямі любові да роднага краю, да яго простых людзей. Складаную задачу — стварыць гармонію паэтычных радкоў і музыкі Вайцюшкевіч выканаў амаль бездакорна: яго рамантычныя мелодыі выклікалі ў слухачоў светлы сум і падкрэслівалі нязгасную любоў паэта да роднай зямлі. «Корчмы» — своеасаблівая літаратурна-музычная сюіта, якая стала камертонам да ўсёй праграмы Зміцера Вайцюшкевіча і яго гурта «WZ-Orkiestra».

Зусім іншы, гумарыстычны настрой запанаваў падчас выканання Зміцерам кампазіцыі на верш «Заяц варыць піва». Рытмічная фолк-балада дадала да праграмы ноту добрай разняволенасці і няўрымслівасці, якімі таксама адорваў сваіх сяброў Уладзімір Караткевіч.

Музычныя кантрасты часта былі характэрнымі для праграмы Зміцера Вайцюшкевіча. За лірычнай «Элегіяй», у якой аўтар музыкі выступіў і як саксафаніст, надышла чарга драматычна-псіхадэлічнай «Балады пра архангелаў». Твор Вайцюшкевіч выканаў двойчы. Як песню і як верш, які быў зачытаны Зміцерам ў першапачатковым варыянце: «Таму што на цяжкіх крылах, // Апушчаных змрочна ў імгле, // Ўссядае Гітлер на правым // Сталін — на левым крыле».

Рознабаковасць Зміцера Вайцюшкевіча як кампазітара была падкрэслена песнямі ўсходняй тэматыкі. У якасці такога твора ў праграму прэзентацыі была ўведзена балада У. Караткевіча «Пяць струкоў перца», у якой узгадваюцца складаныя калізіі армяна-турэцкіх адносін. Відавочна, што гэта кампазіцыя нясе з сабой адбітак усходняй музычнай культуры, якая трансфармуецца праз паэзію Караткевіча і меладызм Вайцюшкевіча.

Некаторыя песні З. Вайцюшкевіча з альбома «Беларуская песня» добра знаёмы слухачам. Як з папярэдніх канцэртных праграм артыста, так і з праектаў, у якіх удзельнічаў Зміцер. Да такіх песень можна аднесці прыпеўкі да аўдыё-пастаноўкі «Ладдзя роспачы» «Моцнае піва», лірычныя кампазіцыі «Безгаловая Венера», «Мора гранітныя хвалі», а таксама выкшталцоны раманс «Укруг месяца туманнае гало...», які мае вялікі поспех у слухачоў ужо доўгія гады.

Самыя вялікія апладысменты выпалі на долю кампазіцыі, якая дала назву альбому Зміцера Вайцюшкевіча, — «Беларуская песня». Гэты спеў — прысяга вернасці Бацькаўшчыне, клятва не зракацца «той гордай мовы, якую і тады не забудзем, калі сонца з зямлёю ў апошні паглыбяцца змрок...» Відавочна, што менавіта ў гэту кампазіцыю Зміцер уклаў усю любоў і піетэт да паэзіі Уладзіміра Караткевіча, якая загучала ў перапоўненай канцэртнай зале сучасна і актуальна. Як і належыць творчай спадчыне Генія.

Трэба адзначыць, што на альбоме «Беларуская песня» запісаны і песні Зміцера Вайцюшкевіча на вершы сяброў У. Караткевіча — паэтаў Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Някляева, Генадзя Бураўкіна. Сярод гэтых твораў трэба адзначыць песню «Месяц — жоўтая лодка», якую слухачы спявалі разам з выканаўцам. Гэтай кампазіцыяй сеанс калектыўных спеваў не скончыўся. Ён працягнуўся, калі на сцэну выйшаў эксцэнтрычна-харызматычны Зміцер Папоў — кіраўнік адной з камерцыйных структур — і заспяваў разам са Зміцерам марш італьянскіх партызанаў «Bella Ciao!». Гэтай кампазіцыяй спявак распачаў заключную частку канцэрта пад ўмоўнай назвай «на біс!».

Напярэдадні новыя прэм'еры: падрыхтавана да друку кніга пра творчасць артыста — «Беларускае слова ад спеву», якую напісалі журналістка Эла Дзвінская, палітык Павел Севярынец і аўтар гэтых радкоў. Як адзін са складальнікаў, не выключаю, што ў гранкі новай кніга тэрмінова давядзецца дадаць новы раздзел — «Уладзімір Караткевіч у песеннай творчасці З. Вайцюшкевіча».




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1234

Падпісана да друку 3.12.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.